Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў КП(б)Б

СЬНЕЖАНЬ 25 1932 г. № 287 (4539)

Год выдавьня XVI

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

Сеньня у нумары

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ — Перамога слуцкіх бальшавікоў. Г. ФУКСОН—Загатоўкі—у цэнтр увагі бальшавіцкага друку (4 стар.).

ВЫНІКІ СЬНЕЖАНЬСКАГА ПЛЕНУМУ ЦК КП(б)Б—Даклад тав. ГАЛАДЗЕДА на сходзе Менскага партыйнага актыву 13 сьнежня г. г. (2-3 стар.).

СЛУЧЧЫНА — ВЯДУЧЫ ЗБОЖЖАВЫ РАЁН РЭСПУБЛІКІ—ВЫКАНАЛА ЗБОЖЖА ЗАГАТОЎЧЫ ПЛЯН (1 стар.).

ПРА ЗАГАТОЎКІ МАСЛА, МАЛАКА І СЫРУ—Пастанова СНК БССР і ЦК КП(б)Б (3 стар.).

Расоны, Сяано і Сіроціна затрымліваюць сьпячэньне ў парміи ільназагатовак (3 стар.).

КАРЗСПАНДЭНЦЫІ: МІНУЦКІ—За засілкаю «саб'ектыўных» прычын (3 стар.). Я. Ів. Дрэнная «чаканка» (1 стар.).

Трыпосная зіма ў Польшчы (4 стар.).

Бой паміж беспрацоўнымі і паліцыяй у Глазго (4 стар.).

Запытаньне Дорыо ў палаце дэпутатаў (4 стар.).

Случчына-вядучы збожжавы раён рэспублікі-выканала збожжазагатоўчы плян

Толькі шэсьць раёнаў БССР выканалі плян па збожжы—пераважная большасьць раёнаў усе яшчэ не узяла баявых тэмпаў работы і ганобна адстае

ВЫШЭЙ ТЭМПЫ! ЗАГАТАЎЛЯЦЬ У ДЗЕНЬ НЯ МЕНШ 5%!

ПЕРАМОГА СЛУЦКІХ БАЛЬШАВІКОЎ

Случні раён — буйнейшы, вядучы збожжавы раён рэспублікі, на долю якога прыпадае звыш 4 проц. усяго рэспубліканскага пляну — выканаў гадавы плян збожжазагатовак.

Перамога слуцкіх бальшавікоў — перамога бальшавіцкай арганізаванасьці ў барацьбе за збожжа. Гэта перамога паняпна прымусіць усе адстаючыя раёны напружыць усю энэргію і ўсе сілы, каб у тыя кананыя дзёны, што засталіся, пераможна завяршыць барацьбу за хлеб, барацьбу за сацыялістычнае будаўніцтва, на генэральную лінію партыі.

У чым «сакрэт» перамогі Случчыны? Ён заключаецца ў тым, што случкія бальшавікі правільна зразумелі свае задачы на збожжазагатоўчым фронце, на адказнейшым вучастку абвостранейшай клясавай барацьбы ў цяперашні момант.

Рашаючыя посьпехі Савецкага саюзу, і ў тым ліку БССР, у барацьбе за сацыялізм, вялізарнейшыя перамогі рабочай клясы і калгаснага сялянства ў барацьбе за перамогу першай пяцігодкі, высунутыя партыяй сусьветна-гістарычнага значэньня задачы вышчэньня клясаў і пабудовы бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва на працягу другой пяцігодкі — выклікалі дзікую, шырэйшую нанавісьць рэшткаў кулацтва, асколкаў разгромленых капіталістычных клясаў, усіх антысавецкіх і антыпралетарскіх элементаў.

Гэта шалёная нанавісьць здыхаючага ворага з асаблівай сілай праявілася ў стрыме барацьбы за збожжам, на важнейшым вучастку барацьбы за індустрыялізацыю краіны і калектывізацыю сельскай гаспадаркі. Кулак, апартуніст, пераражэнец, вялікадзяржаўны і нацыяналістычны элементы, ворагі пралетарскай дыктатуры з партбілетамі ў кішэні прабуюць папяхоўць пралетарскай дзяржаве і будаўніцтву сацыялізму на важнейшым вучастку барацьбы за збожжа і стараць для нас затрудненьні ў спачэньні пралетарскіх цэнтраў краіны.

Улюбёны маневр ворага — распальваньне рвацкіх і спекулянцкіх тэндэнцый сярод адсталых пластоў вёскі. Кулацкія элементы, угнэзьдзіўшыя ў калгасах і зрываючы загатоўкі, тым самым прабуюць падарваць калгаснае будаўніцтва з сярэдзіны.

Кіраўнікі раду раённых арганізацый, з прычыны страты рэвалюцыйнай чуйнасьці, дазволілі кулаку арганізаваць супраціўленьне выкананьню загатоўчых пляноў. У некаторых вымясках (Жлобінскі, Чырвонапольскі, Лоеўскі, Нараўлянскі, Чачэрскі раёны) мы мелі і простае спаўзаньне з клясавых рокаў, простае зрэчваньне з кулаком, здрадніцтва інтарэсам партыі.

Случкія бальшавікі таму і атрымалі перамогу на збожжазагатоўчым фронце, што зялелі аказаць рашучы адпор дэзарганізатарам збожжазагатовак, мабілізаваць актыўнасьць калгаснай і бядняцка-серадняцкай масы і рашуча залучыць супраціўленьне кулака. Яны вялелі правільна спалучыць шырокую работу ў масах калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў з арганізаваным націскам на тых, што ўхіляюцца ад выкананьня сваіх абавязацельстваў перад дзяржавай.

Случкі раён мог-бы, відома, і раней выканаць свой плян, калі-б з самага пачатку кампаніі разгарнуў бальшавіцкую барацьбу за збожжа, калі-б у раёне па першым этапе загатоўчай работы ня было элементаў супакойнасьці, што плян будзе выкананы без асаблівых затрудненьняў і намаганьняў.

Аднак, на фоне рэзкага адставаньня ў выкананьні загатоўчага пляну большасьці раёнаў і рэспублікі ў цэлым, завяршэньне збожжазагатовак у вядучым збожжавым раёне БССР набывае значэньне буйнай перамогі.

Выкананьне Случкім раёнам збожжазагатовак дае новы пераканаўчы доказ рэальнасьці загатоўчага пляну.

Нішчэі, апартуністы і пераражэнцы, апраноючыся ў тогу абаронцаў інтарэсаў калгаснага і аднаасобнага бядняцка-серадняцкага сялянства, у сувязі з апошнімі мерамі ЦК і СНК БССР па рашучай ліквідацыі гнілых лібэральных адносін да загатовак, «перасьпярагаюць» ужо супроць таго, «як-бы чаго ня вышла», як-бы не перабраць. Неабходна выкрыць гэтых «абаронцаў» сялянскіх інтарэсаў як зьлейшых ворагаў калгаснага і ўсяго працоўнага сялянства, як простых агентаў кулака.

Аб рэальнасьці пляну з усёй пераканальнасьцю гавораць лічбы. Спагнаньне збожжа па загатоўках складае ўсяго толькі 4,8 проц. усяго валавога збору, супроць 8.8 проц. у мінулым годзе. На кожны заселены гектар збожжа прыпадае ўсяго толькі 1,8 пуда. Увесь плян па рэспубліцы складае ўсяго толькі 4 млн. пудоў. Ці могуць быць якія-небудзь сумненьні ў рэальнасьці падобнага пляну?

Якраз у тым і заключаецца адна з асноўных прычын нашага адставаньня ў збожжазагатоўках, што ў нас было занадта многа бястурботнасьці адносна выкананьня гэтага пляну. Наколькі плян маленькі, бясспрэчна рэальная, значна меншы за леташні, партыйныя і савецкія арганізацыі, пераацэньваючы сілы супраціўленьня недабітага кулака, лічылі, што ён будзе выкананы без усякіх затрудненьняў, у парадку самацёку.

Сапраўднасьць дала цяжкі ўрок. Гэтым настрой супакойнасьці, адсутнасьці бальшавіцкай настарожанасьці дазволілі кулакам і анархіствуючым элементам вёскі аказаць сур'ёзнае супраціўленьне выкананьню збожжазагатоўчага пляну. У рэзультаце стварыў ся зьзяючы прарыў, рэзкае адставаньне нашай рэспублікі, на ліквідацыю якога прыходзіцца цяпер мабілізаваць усе сілы і сродкі. Нам выключна баявымі тэмпамі прыходзіцца цяпер наганяць прапушчаны час.

Часу ў нас засталося надзвычай мала. Тармін пальходзіць к канцу. Вялізарнейшым натружаньнем усіх сіл неабходна дабіцца поўнай перамогі на загатоўчым фронце. Гэта перамога магчыма толькі пры ўмове рашучага падаўленьня кулака, непрымірымай барацьбы супроць дэзарганізатараў збожжазагатоўчага фронту.

Няхай адстаючыя раёны раўняюцца ў барацьбе за збожжа па буйнейшым і вядучым збожжавым раёне рэспублікі — Случчыне.

А Случкі раён, выканаўшы свой раённы плян, не пазбегне дэмабілізаваць сваіх сіл, а яшчэ ўзмацніць барацьбу за выкананьне заданьня кожным сельсаветам, кожным калгасам і паасобнай гаспадаркай.

Дрэнная „чаканка“

БАРЫСАЎ. (Наш кар.). Гэтымі днямі адбыўся па-зачаравоў адкрыты сход Карсакаўскай ячэйкі КП(б)Б, на якім прысутнічала 100 беспартыйных калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў. На сходзе прысутнічалі таксама нам. старшыні СНК БССР тав. Грысевіч і рад раённых кіруючых работнікаў.

Першае слова для дакладу аб ходзе загатовак атрымаў старшыня сельсавету тав. Калячонак.

— Я буду коратка гаварыць, — цяпер трэба «чаканіць» лічбамі.

«Чаканка» аказалася дрэннай. Калі калгасьнікі замест 205 цэнт. збожжа, далі 209, дык аднаасобнікі здалі 187 цэнт. збожжа пры заданьні ў 230. Кулацка-заможныя гаспадаркі здалі па цвёрдых заданьнях 157 цэнт. замест вызначаных 179. Работа па ільнязагатоўках амаль не пачыналася.

Такія незадавальніі работы ў сельсавеце, дзе калектывізавана 80 проц. гаспадарак, дзе ва практычнай праны вырас моцны калгасны актыў. У гэтым сельсавеце — адна з буйнейшых вясковых партыйных ячэек, у якой налічваецца 20 членаў партыі і кандыдатаў: у двух калгасах ёсьць камсамольскія ячэйкі. Пры такіх умовах можна паказаць узорную работу па загатоўках.

Ніякай работы не вялося з калгасным актывам і аднаасобнікамі — беднякамі. У самым пачатку кампаніі сельсавет захапіўся «лявацкімі» затібкамі, давёўшы цьвёрдыя заданьні да маламоцных серадняцкіх гаспадарак. «Лявацкае» адміністраваньне толькі ўзмацніла пазыцыі клясава-варожых элементаў. Пасьля таго, як РВК выправіў гэтыя скажэньні, кіраўніцтва сельсавету ўдарылася ў другую крайнасьць, перадаўшы ўсю работу сельскаму суду. Апошні ня маючы на гэта ніякага права, павялічаў і зьмяшаў заданьні па здачы збожжа. А сельсавет аддаўся самацёку. Сакратар партячэйкі Ялуга сваю бязьдзейнасьць апраўдвае перагружанасьцю работай, як настаўнік, а галавацяпства пастановы сельскага суда тлумачыць... наведаньнем функцый судовых устаноў.

У сваім выступленьні на сходзе ячэйкі тав. Грысевіч пакрэсьліў задачы камуністаў у барацьбе за збожжа, неабходнасьць бязьлітаснага змаганьня з усякімі праяўленьнямі лібэральна-апартуністычных адносін да выкананьня пляну загатовак. Тав. Грысевіч унёс рад канкрэтных прапаноў, якія павінны быць пакладзены ў аснову барацьбы за завяршэньне загатовак.

Я. Ів.

Тав. Галадзед—у Чэрвеньскім, Смалявіцкім і Дзяржынскім раёнах

З 20 па 24 сьнежня старшыня СНК БССР тав. М. М. ГАЛАДЗЕД наведаў рад сельсаветаў Чэрвеньскага, Смалявіцкага і Дзяржынскага раёнаў, дзе знаёміўся з ходам загатовак. Тав. Галадзед прысутнічаў на сходах раённага актыву, а таксама выяжджаў у вёскі, дзе выступаў на сходах калгасьнікаў і аднаасобнікаў.

У Чэрвеньскім раёне тав. Галадзед наведаў Вайнілаўскі сельсавет, у Смалявіцкім—Драчкаўскі, у Дзяржынскім—Путчынскі сельсавет.

У сваіх выступленьнях на сходах тав. Галадзед завастрыў увагу працоўных мас вёскі на мандэтах клясавага ворага і падкрэсьліў неабходнасьць разгрому кулацкага сабатажу і поўнага выкананьня пляну загатовак.

Працоўныя аднаасобнікі Путчынскага сельсавету ў гонар тав. Галадзеда арганізавалі чырвоны абоз са збожжам і пастанавілі да 25 сьнежня выканаць плян загатовак.

Чорная дошка зрыву загатовак

За злоснае і сыстэматычнае невыкананьне пляну дзяржаўных загатовак сельгаспрадуктаў, за сабатаж, арганізаваны кулацкімі элементамі, пастановай СНК БССР і ЦК КП(б)Б занесены на чорную дошку наступныя раёны і сельсаветы:

Раёны:

1. Талачынскі, 2. Горацкі, 3. Кармянскі, 4. Дубровенскі, 5. Асьвейскі.

Сельсаветы:

па Чачэрскім раёне: Будзішчанскі і Глыбачанскі,

па Буда-Кашалёўскім: Нядальскі, Патапаўскі і Губіцкі,

па Менскім раёне: Каралішчанскі, Абчацкі, Папярнянскі,

па Віцебскім: Старасельскі і Рудакоўскі,

па Сеньненскім: Машчонскі і Алексінскі,

па Дзяржынскім: в. в. Станкава, Каменка і Шатаноўшчына.

У гэтых раёнах і сельсаветах неадкладна спыняецца падвоз тавараў і каапэрацыйны і дзяржаўны гандаль на месцы.

Вывозяцца з каапэрацыйных крам і складаў усе наяўныя прамтавары.

Поўнасьцю забараняецца калгасны гандаль.

Спыняецца ўсякага роду крэдытаваньне і датэрмінова спаганяюцца ўсе выданыя крэдыты і інш. фінансавыя абавязацельствы.

ДАДАТКОВА ЗАНОСЯЦЦА НА ЧОРНУЮ ДОШКУ НАСТУПНЫЯ СЕЛЬСАВЕТЫ:

па Пятрыкоўскім раёне: Ліпініцкі, Гліненскі і Асавецкі сельсаветы,

па Клімавіцкім раёне: Красавіцкі сельсавет,

па Лепельскім раёне: Ляхаўскі сельсавет і вёскі Бабча, Кругляцы і Стаўбцы,

па Чэрыкаўскім раёне: Каменскі сельсавет,

па Бягомльскім раёне: Дамарыцкі сельсавет,

па Чавускім раёне: Праздноўскі, Рабаўскі і Дзеднаўскі,

па Лагойскім раёне: Гайнінскі.

СЛУЧЧЫНА ПЕРАВЫКАНАЛА ЗАДАНЬНЕ

Рапарт ЦК КП(б)Б, СНК, „Зьвязьдзе“

СЛУЦАК. (Па тэлеграфу). Пад непасрэдным бальшавіцкім кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б, на аснове поўнай мабілізацыі і правільнай расстаноўкі партыйных сіл, згуртаваньня беспартыйнага актыву вакол партарганізацыі, на аснове шырокага разгортваньня палітычна-масавай работы сярод калгасных і бядняцка-серадняцкіх мас, дзякуючы рашучай ліквідацыі кулацкага сабатажу, бязьлітаснаму выкрываньню і выгнаньню з радоў партыі апартуністычных элементаў, бальшавікі Случчыны 22 сьнежня перавыканалі гадавы плян збожжазагатовак у ліку 3.150 тон і насеннпазыкі ў 70 тон.

Змагаемся за поўнае выкананьне пляну па збожжу асобнымі сельсаветамі і дварамі, а таксама за сканчэньне ў тэрмін загатовак ільну, мяса і бульбы.

Райком КП(б)Б СОСКІН
РВК АРДЫНЦОЎ.
„Загатзбожжа“ КАНДРАСІК.

Менскі раён скончыў плян збожжазагатовак

Менскі раён гадавы плян збожжазагатовак разам з насеннпазыкай выканаў на 24 сьнежня на 100,15 проц.

ЧЫРВОНАЯ ДОШКА

За ўзорныя тэмпы барацьбы за збожжа, за мабілізацыю мас калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў на ліквідацыю кулацкага сабатажу заносім на чырвоную дошку наступныя раёны:

1. **Тураўскі раён**—выканаў 106,1 проц. гадавога пляну,
2. **Жыткавіцкі раён**—выканаў 105,7 проц. заданьня,
3. **Вузьдзенскі раён**—выканаў 101,8 проц. пляну,
4. **Камарынскі раён**—выканаў 101,6 проц. заданьня,
5. **Случні раён**—выканаў 100,1 проц. пляну,
6. **Менскі раён**—выканаў 100,1 проц. заданьня.

ТЭМПЫ ЗБОЖЖАЗАГАТОВАК ПА БССР

(У проц. да гадавога пляну разам з насеннпазыкай)

На 21 сьнежня	На 22 сьнежня	На 23 сьнежня
68,7	70,0	72,0

ВЫШЭЙ РЭВАЛЮЦЫЙНУЮ ПІЛЬНАСЬЦЬ!

За баявую мабілізацыю сіл на пераможнае завяршэньне сельска-гаспадарчых загатовак

Рэзалюцыя сходу Менскага партактыву па дакладу тав. Гікало

23 сьнежня 1932 г.

Сход Менскага партактыву, заслухаўшы даклад тав. Гікало аб ходзе загатовак па Беларусі, поўнасьцю і цалкам ухваляе пастанову ЦК УсеКП(б), якая дала выразную бальшавіцкую ацэнку прычынам незадавальняючага ходу загатовак па БССР і якая вызначыла канкрэтныя шляхі хутка та і рашучага пералому.

Партактыў лічыць, што незадавальняючы ход загатовак тлумачыцца наяўнасьцю гнілаліберальных адносін партыйных і савецкіх арганізацый Беларусі, якія выявіліся ў тым, што своячасова ня былі прыняты меры да зьнішчэньня спроб рэштак кулацтва арганізаваць сабатаж загатовак як у аднаасобным, так і калгасным сэктары, ня былі своячасова прыняты меры да ачышчэньня КП(б)Б ад пераражэнскіх, варожых бальшавізму, элементаў, якія хаваюцца за партбілетам і па справе дапамагаюць кулаку арганізоўваць сабатаж дзяржаўных загатовак.

Партактыў лічыць, што бягомльская справа, дзе раённае кіраўніцтва, баючыся ўскрыць свае памылкі, стала на шлях абароны кулакоў, жлобінская справа, дзе сакратар райкому, член ЦК партыі, выступіў абаронцам кулацкіх элементаў; у свой час ускрытыя гнойнікі ў Ветлы, у Пятрыкова, якія сьведчаць аб пераражэньні асобных камуністаў і засьмечанасьці нашых радоў клясава-варожымі элементамі; некаторая актывізацыя рэштак нацдэмаўшчыны, што знайшла свой адбітак у літаратурных выступленьнях антысавецкага характару ў друку (Сідаранка і Нікановіч у «Беларусі калгаснай», Баранавых у «ЛМ», знаёбетыка беларускага кулацтва ў артыкуле Гесэна ў часопісі «Бальшавік Беларусі»), выступленьне нацдэмаўскага буржуазна-пераражэнскага характару ў партклетыце «Зьвяны» (справа Войнава і інш.),—будучы выразам антывізацыі клясава-варожых элементаў, ня былі ў выстарчальнай меры скарыстаны партарганізацыяй для бальшавіцкага выкананьня партыйных мас і ня выклікалі з боку партарганізацыі неабходнага навышэньня клясавай пільнасьці і бальшавіцкай непрымірымасьці да клясавага ворага і яго агентуры, ня гледзячы на рашучыя заходы і важнейшыя рашэньні, прынятыя па гэтых справах ЦК КП(б)Б.

Бальшавіцкае выкананьне пляну загатовак поўнасьцю і ва ўстаноўленыя тэрміны патрабуе самай бязьлітаснай барацьбы са слазвена-дэкляцыйнымі адносінамі камуністаў у праведзеньні генэральнай лініі партыі, з гнілымі пераражэнскімі элементамі, як зьлейшымі ворагамі партыі рабочай клясы і калгаснага сялянства, якія, прыкрываючыся партбілетам, ашуквяюць дзяржаву, партыю і арганізуюць зрыў заданьняў партыі і ўраду ва ўгоду кулакам і інш. антысавецкім элементам. Толькі выпаўшы з радоў партыі гнілыя, пераражэнскія і буржуазна-нацыяналістычныя элементы, якія часта прыкрываюць сваю антысавецкую работу фальшыва-нацыянальным сьцягам, толькі бязьлітасна расправіўшыся з контр-рэвалюцыйнымі трацкісцкімі элементамі (Мазырская справа, БАН і г. д.) і толькі пры ўмове бальшавіцкай мабілізаванасьці ўсёй КП(б)Б, непрымірымай барацьбы з правым уклонам, як галоўнай небясьпекай, «лявацкім» затібкам і прымірэнцтвам,—КП(б)Б зможа зламаць контр-рэвалюцыйны сабатаж загатовак, які арганізуецца кулацкімі і антысавецкімі элементамі.

Пацыхожячая чыстка партыі, намечаная рашэньнем ЦК УсеКП(б), павінна яшчэ больш умацаваць партыйныя рады, яшчэ шчыльней згрупаваць вакол партыі мільёны масы пралетарыяту і калгасьнікаў на бальшавіцкае ажыцьцяўленьне задач сацыялістычнага будаўніцтва.

Партактыў поўнасьцю ўхваляе апошнія мерапрыемствы ЦК, СНК і ЦКК КП(б)Б, накіраваныя да стварэньня неадкладнага і рашаючага пералому ў ходзе загатовак—выключэньне з партыі раду сакратароў райкомаў, старшынь РВК і старшынь РККК, пераражэнцаў, гнілых лібэралаў, зьняцьцё з работы і аданьне пад суд раду суддзяў, якія сваімі слабымі раённымі ў адносінах да спраў кулакоў заахвочваюць супраціўленьне клясавага ворага мерапрыемствам партыі і ўрада, ужываньне штрафу мясам да нядатычнай па дзяржаўных загатоўках; заносіньне на чорную дошку раёнаў, злосна сабатуючых загатоўкі і ўжываньне ўсіх выпрабаваных адзоль захадаў эканамічнага і адміністрацыйнага парадку, ня спыняючыся перад ужываньнем самых суровых мер пралетарскай дыктатуры ў адносінах да ворагаў рабочай клясы, аж да ўжываньня вышэйшай меры пакараньня.

Партактыў ад імя Менскай партарганізацыі бярэ шэфства над Дубровенскім і Талачынскім раёнамі, заносенымі на чорную дошку, абавязваючыся на працягу двух дзён пасьля ўхваленьня гэтым раёнам 50 лепшых актывістаў Менскай партарганізацыі, у тым ліку 10 на пастаянную работу.

Партактыў лічыць неабходным таму з усёй выразнасьцю заявіць, што Менская партарганізацыя ў першую галаву нясе адказнасьць за незадавальняючы ход загатовак па БССР, што з боку Менскай партарганізацыі невыстарчальна былі скарыстаны ўсе магчымасьці для ўмацаваньня пралетарскага кіраўніцтва калгасным вёскі, што Менскі раён ня вытрымаў тэрмінаў выкананьня пляну загатовак збожжа і бульбы, устаноўленых пленумам ЦК КП(б)Б.

Партактыў Менскай партарганізацыі не сумняваецца ў тым, што бальшавікі Беларусі, на аснове разгорнутай бальшавіцкай самакрытыкі, пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б на чале з т. Гікало, у бліжэйшыя дні зламаюць супраціўленьне кулацкіх і інш. антысавецкіх элементаў і пакладуць канец яшчэ не пераможнаму і ва сёньня адставаньню ў выкананьні загатовак па БССР.

Той факт, што ЦК КП(б)Б па-бальшавіцку выкрыў і прызнаў дапушчаныя памылкі і рашуча стаў на шлях іх выпраўленьня пояньцьцем раду канкрэтных разгорнутых захадаў, дае ўпэўненасьць у тым, што пад кіраўніцтвам ЦК УсеКП(б) кампартыя Беларусі зможа выканаць с.-г. загатоўкі поўнасьцю ва ўстаноўленыя тэрміны.

Няхай жыве ЦК УсеКП(б), які ажыцьцяляе канкрэтнае ленінскае кіраўніцтва!

Няхай жыве правадыр нашай партыі тав. Сталін!

Ход загатовак збожжа

(у процантах да гадавога пляну на 23 сьнежня 32 г. разам з насеннпазыкай)

Назва раёну	Процант выкананьня	Назва раёну	Процант выкананьня
1. Тураўскі	106,1	40. Гарадоцкі	69,3
2. Жыткавіцкі	105,7	41. Лепельскі	69,1
3. Вузьдзенскі	101,8	42. Ратамскі	69,0
4. Камарынскі	101,6	43. Гомельскі	68,2
5. Случкі	100,1	44. Лёзьнянскі	67,8
6. Ельскі	96,7	45. Глускі	67,4
7. Менскі	95,9	46. Магілеўскі	66,7
8. Лельчыцкі	94,8	47. Чавускі	66,5
9. Стара-Дарожскі	92,9	48. Жлобінскі	66,0
10. Чырвона-Слабодзкі	89,7	49. Смалявіцкі	65,6
11. Лагойскі	86,3	50. Крупскі	65,1
12. Любанскі	85,0	51. Дубровенскі	64,1
13. Асіпавіцкі	84,4	52. Уваравіцкі	63,2
14. Бярэзінскі	83,2	53. Дзяржынскі	61,3
15. Старобінскі	82,9	54. Рэчыцкі	60,9
16. Заслаўскі	82,1	55. Расонскі	60,7
17. Мсьціслаўскі	81,9	56. Сеньненскі	59,9
18. Брагінскі	81,9	57. Быхаўскі	59,9
19. Чэрвеньскі	81,4	58. Клічаўскі	59,5
20. Полацкі	78,3	59. Суражскі	59,3
21. Барысаўскі	78,3	60. Крычаўскі	58,9
22. Пухавіцкі	78,1	61. Вушацкі	58,7
23. Капыльскі	77,9	62. Талачынскі	57,8
24. Бабруйскі	77,8	63. Гомельскі	57,2
25. Чэрыкаўскі	77,7	64. Хойніцкі	57,2
26. Бешанковіцкі	77,5	65. Асьвейскі	55,8
27. Веткаўскі	77,4	66. Чачэрскі	55,8
28. Плешчаніцкі	76,3	67. Буда-Кашалёўскі	55,8
29. Касьцюковіцкі	76,3	68. Пятрыкаўскі	55,2
30. Клімавіцкі	76,2	69. Нараўлянскі	54,7
31. Віцебскі	75,3	70. Кармянскі	52,4
32. Пярыцкі	75,2	71. Чырвонапольскі	51,9
33. Сіроцінскі	74,2	72. Чашніцкі	51,6
34. Бялынічскі	73,1	73. Прылукскі	51,3
35. Мазырскі	72,0	74. Лоеўскі	51,3
36. Шклоўскі	71,7	75. Горацкі	49,1
37. Церахаўскі	70,3		
38. Аршанскі	69,8		
39. Дрысенскі	69,5	Разам па БССР	72,0

ВЫНІКІ СЬНЕЖАНЬСКАГА ПЛЕНУМУ ЦК КП(б)Б

Даклад тав. ГАЛАДЗЕДА на сходзе Менскага партыйнага актыву 13 сьнежня г. г.

Пад знакам разгорнутай самакрытыкі

Таварышы! Сьнежаньскім пленумам ЦК КП(б)Б былі разглядзены наступныя пытаньні:

пра ўдзым ураджайнасьці і падрыхтоўку да весьнавой пасеўнай кампаніі 1933 г.;

пра выкананьне сельска-гаспадарчых заготовак;

пра выкананьне пастановы ЦК УсесКП(б) па масавай школе і вышэйшых навучальных установах і

разгляды раду раёнаў пра партыйна-масавую работу.

Трэба, у першую чаргу, адзначыць, што апошні пленум ЦК КП(б)Б праходзіў пад знакам шырока разгорнутай бальшавіцкай крытыкі і самакрытыкі. Характэрным моментам работы гэтага пленуму зьяўляецца яшчэ і тое, што мы слухалі не проста тыя ці іншыя пытаньні, а спрэзадчы адпаведных дакладаў і ўстаноў па ажыцьцяўленьні дырэктыў партыі па канкрэтных пытаньнях і абмеркавалі ўсе гэтыя пытаньні паралку дня, мошна як справаздачныя даклады.

Усе гэтыя практычныя, але надзвычай важныя пытаньні бягучага часу былі ўзьняты пленумам на вялікую прынцыповую вышыню. Разгортванье крытыкі і самакрытыкі нашых недахопаў, а іх у нас ёсьць яшчэ ня мала, дало нам магчымасьць абмеркаваць з найбольшай паўнатой усе важнейшыя пытаньні.

Такія пытаньні, як удзым ураджайнасьці, перабудова работы школ і ВНУ, сельска-гаспадарчыя заготоўкі, нарэшце работа, — зьдуваюцца важнейшымі пытаньнямі бягучага часу. Практычнае ажыцьцяўленьне прынятых пастаноў пленуму зьяўляецца таму самай актуальнай, самай галоўнай задачай кожнага камуніста, кожнага камсамольца, кожнага работніка савецкіх, гаспадарчых, прафсаюзных і кааперацыйных арганізацый.

I. Пытаньне ўраджайнасьці—цэнтральная задача

Пачну з пытаньня аб удзыме ўраджайнасьці і аб плоне весьнавой сяўбы. Тым посьпехі ў калгасным руху, якія мы маем на ўсім СССР і ў нас, у БССР, калі вам магчымасьць абʼяднаць у калгасах і засеяць каля 80—90 проц. зямлі на ўсім Саюзе і 60 проц. на БССР.

Дзякуючы намаганьням партыі і посьпехам у сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі мы маглі забяцаць пашырэньня пасеўнай плошчы на ўсім СССР супроць дазаўпнага часу на 30 млн. га, а па БССР на 1,25 млн. га. Такім чынам мы дабіліся вялізарнейшых посьпехаў у росьце сельскай гаспадаркі ў шырыню. І таму ЦК УсесКП(б) і СНК Саюзу яшчэ ў верасьні месяцы паставілі, што на бліжэйшы перыяд галоўнейшай задачай у галіне ўдзыму сельскай гаспадаркі на вышэйшую ступень зьяўляецца задача павышэньня ўраджайнасьці. Гэта — цэнтральная задача на сучаснай стадыі разьвіцьця сельскай гаспадаркі. Выцякае яна з таго, як я вам указаў раней, што мы дасягнулі значных посьпехаў у сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі і пераводзе яе на калгасны шлях.

Для таго, каб выканаць пастанову СНК і ЦК аб удзыме ўраджайнасьці, трэба добра падрыхтавацца да вясны 1933 г. Я павінен, між іншым, адзначыць, што і ў папярэдніх галы задача на ўдзыме ўраджайнасьці ня зьнімалася з паралку дня. Праўда, ня ўсюды за яе вялі барацьбу, як сьлед. Барацьба за прырост пасеўных плошчаў ніяк не азначала таго, што мы павінны былі закідаць работу па ўдзыме ўраджайнасьці. Але зараз гэта праблема высоўваецца, як самая вострая, самая базавая праблема. І невыпадкова ЦК УсесКП(б) і СНК СССР вынесьлі пастанову спыніць прырост пасеўных плошчаў пад тэхнічнымі і прамышлымі культурамі.

Такім чынам, у справе падрыхтоўкі да вясны 1933 г у цэнтр увагі ўсёй работы партыйных, савецкіх, камсамольскіх і грамадзкіх арганізацый трэба паставіць задачу ўдзыму ўраджайнасьці. Каб гэту задачу выканаць на справе, а не на словах, нам трэба па-баявому, узброена падрыхтавацца да вясны 1933 г.

Пленум, праверыўшы работу нашых арганаў па падрыхтоўцы да вясны, прызнаў гэту работу па практычным выкананьні дырэктыў аб удзыме ўраджайнасьці нездавальняючай. Пленум у сваёй пастанове асабліва гэта падкрэсьліў.

Пераняць вопыт лепшых калгасаў

Практычна перад намі стаяць такія задачы:

Па-сапраўднаму, не на словах, а на справе, пераключыць работу ўсіх партыйных, савецкіх, камсамольскіх і гаспадарчых арганізацый, працуючых у галіне сельскай гаспадаркі, у кірунку павышэньня ўраджайнасьці па ўсіх, без выключэньня, культурах, як на цэнтральную задачу разьвіцьця сельскай гаспадаркі ў сучасны момант. Нам трэба ў будучы з гэтым сваячасова ссыпаць насеньне, стварыўшы насенныя фонды ў кожным калгасе, а таксама і накапапіцца, каб гэтыя самыя фонды былі і ў адпаведным сэктары, прычым яны ссыпаць насенных фондаў падбіраць лепшай якасьці збожжа, бульбу і іншыя культуры, бо ад якасьці насеньня залежыць узровень ураджайнасьці.

Нам трэба таксама скарыстець усе магчымасьці па накапленьні гатунковага насеньня, распісчуць на вычастку насеньня да вясны, бо гэта яшчэ на 50 проц. прадвырашае тую задачу, якую мы ставім перад сабой.

Пленум прыняў, як мінімум, давесьці ўраджай абагульненых культур да 50 цэнтн. з га, гэта значыць 50—51 пудоў гаспадарчага ўраджаю.

Мы таксама прынялі пастанову аб тым, каб удзым ураджайнасьці ільнавалакна давесьці мінімум да 3,5 цэнтн. з га. Гэта задача цяжкая, бо зараз мы атрымліваем, прыкладам, 2,5—2,8 у сярэднім па БССР.

Нам трэба пераняць прыклад лепшых нашых калгасаў, а такія прыклады па БССР ёсьць, калі калгасы даюць 4—6 цэнтн. ільнавалакна з га. Такіх калгасаў нямала. Але большасьць дае яшчэ зусім нізкі ўраджай. Значыць, ва ўмовах БССР пры бальшавіцкім змаганьні за ўдзым ураджайнасьці мы зможам атрымаць вось гэтыя 3—4 цэнтн. з га, а гэта вырашае пытаньне, бо вы ведаеце, што лён — культура працаёмкая. Сяўба, уборка, пралоўка, догляд ільну патрабуюць шмат увагі, шмат працаздзен. І калі мы працуем з максымальнай затратай працаздзён на 1 га і атрымліваем мінімум ураджайнасьці, — такога становішча мы ў далейшым цярпець ня можам. Нам трэба пры такой-жа затраце сілы атрымаць з га ў два разы больш ільну, чым мы атрымліваем зараз, а для нас гэта мае вялізарнае значэньне, ня меншае, чым удзым ураджайнасьці па збожжавых культурах, бо мы спэцыялізуем нашу сельскую гаспадарку БССР у кірунку разьвіцьця тэхнічных культур, галоўным чынам ільну. Мы [illegible] адным з асноўных [illegible] СССР па разьвіцьці ільнаводзтва.

Таксама прынятыя абавязковыя лічбы, як мінімальныя, па ўдзыме ўраджайнасьці іншых культур сельскай гаспадаркі БССР (бульба і інш.).

Па-баявому падрыхтавацца да вясны

Але прыняць пастанову — гэта ня ўсё. Трэба яе ажыцьявіць. У гэтым зараз стрыжань пытаньня. У ажыцьявіць гэтыя пастановы гэта значыць яшчэ раз, не трапяючы ніводнага дня, кожнай гадзіны, кожнай арганізацыі трэба, не пакладаючы рук, працаваць [illegible] падрыхтоўкай да весьнавой пасеўнай кампаніі. Трэба пераключыць работу арганізацый партыйных, савецкіх, камсамольскіх, прафсаюзных, выкліканых з разьвіцьцём сельскай гаспадаркі іменна ў гэты бок. Гэта значыць ссыпаць насеньне, падрыхтаваць інвэнтар, адрамантаваць машыны, гэта значыць накапіць угнаеньне. Бо беларуская глеба апрача добрай апрацоўкі не патрабуе яшчэ і ўгнаеньня.

А што значыць накапіць угнаеньне? Гэта значыць на толькі спадзявацца на гной, які мы атрымаем ад перазімоўкі жывёлы, але так сама скарыстаць у максымальнай ступені на ўгнаеньне торф, попел. Трэба сказаць, што пра збор попелу і скарыстаньне торфу мы проста забылі.

Прыпамятайце, пару год таму назад камсамол быў шэфам над зборам попелу. А цяпер мы яго забылі пра гэта. Збіраць попел, скарыстаць яго для выкананьня важнейшай дырэктывы партыі — гэта задача ў вышэйшай ступені пачэсная, бальшавіцкая задача.

Нам трэба дамагацца, каб больш вырабіць мінэральнага ўгнаеньня з нашага мясцовага сыраду, гэта значыць распрацоўка фасфарыту і г. д., якія ў нас ёсьць. Мала вырабляць мінэральнае ўгнаеньне. Нам трэба ўмець і скарыстоўваць яго. Наша нішчасьце заключаецца ў тым, што часта мы тую ці іншую справу пачынаем, але да канца не даводзім. Бываюць выпадкі, калі сабраны ў кучу попел разьвейваецца ветрам, ня вывозіцца на палі. Бываюць выпадкі, калі завезеныя мінэральныя ўгнаеньні ў нас на станцыях топчуцца нагамі, разьвейваюцца ветрам. І цяпер ёсьць у нас такія выпадкі, калі прывезенае мінэральнае ўгнаеньне на станцыі ляжыць. Баюся, што некаторыя начальнікі станцыі за тое, што не выкуплае спажывец ці атрымальнік гэтага грузу, будуць прадаваць з аўкцыёну гэтае мінэральнае ўгнаеньне, або выгружаць пад адкос, каб не займаць гэтым грузам вагоны.

Усе многія гавораць аб тым, што ў нас, у Крычаве, ёсьць шмат магчымасьцей па вырабе фасфарыту, а яго мы можам скарыстаць для ўдзыму ўраджайнасьці ільну. Гаворыць, што ўжо ў Бабруйскім раёне знойдзены значныя паклады фасфарыту, што дае магчымасьць арганізаваць прамысловую распрацоўку.

Мы задачу па ўдзыме ўраджайнасьці можам выканаць, калі адначасова з добрай апрацоўкай зямлі (а гэта справа бясспрэчная для ўсіх) зможам мабілізаваць усе нашы рэсурсы на ўгнаеньне глебы.

Пра скарыстаньне торфу на ўгнаеньне многія ўжо забылі. Трэба сказаць і на актыве, што і наша агранамія таксама, па-мойму, неяк пасьпўна стала ў гэтых адносінах працаваць. Раней хопь пісалі многа пра матэрыялы, якія скарыстаньня торфу для ўгнаеньня, а цяпер і пісаць кінулі, не гаворачы ўжо аб непаваротлівасьці ў гэтых адносінах.

Перабудаваць работу земорганаў

Ва адно зь практычных задач па ўдзыме ўраджайнасьці трэба дадаць задачу перабудовы работы земельных органаў, каб яны былі сапраўды органамі барацьбы за ўдзым ураджайнасьці калгасных палёў і палёў саўгасаў.

Па рэчы, трэба сказаць, што пастановай ЦК і савецкіх органаў калгасоўцы вызвалі з асмоктаньня. Цяпер, у сувязі з вялікім наркамаўскім сяўгасаў. Саюзу, справа абкладваньня калгасаў, арганізацыя і гаспадарчае іх умацаваньне ускладзена на сыстэму НК Земляробства, ліквідаваны калгасаўцы, Калгасцэнтр і раённыя саюзы.

У сувязі з гэтым мы асабліва павінны завастрыць увагу на перабудове работы нашых земельных органаў як тут, у цэнтры, так і на месцах, асабліва разьмеркаваньні.

Трэба тэмацніць земельныя органы прадаўжаюць узмацніць кіраўніцтва гэтымі земельнымі органамі з боку партарганізацый аж да парт'ячэек на вёсцы.

За адно трэба ажыцьвіць, вышэй узьняць работу нашых навукова-дасьледчых устаноў, каб яны сталі не габінэтнымі установамі, не лябараторнымі установамі, а каб яны былі практычнымі рэсурсаднікамі агранамічнай культуры на калгасных і саўгасных палёх.

Падчас за ўвесь свой рост задача аўладаньня агратэхнікі а боку кожнага члена партыі, а боку кожнага камсамольца, з боку кожнага калгасьніка.

Не аўладаўшы тэхнікай у галіне сельскай гаспадаркі нельга думаць аб удзыме ўраджайнасьці. Уатым ураджайнасьці зьвязана з высокай тэхнікай, а высокая агранамічная культура.

Мы павінны аўладаць на ўсе 100 проц. гэтай культурай. А ў сувязі з гэтым мы павінны патрабаваць ад нашых навукова-дасьледчых устаноў у сотні раз палепшыць сваю работу. Штосьці пра іх мала чуваць.

Праўда, некаторыя асобныя дасьледчыя ўстановы, скажам, Менская дасьледчая станцыя па расьлінаводзтву і Горацкая станцыя па ільнаводзтву, даюць прыклады добрай работы па асобных пытаньнях.

Вось мы нядаўна слухалі ў СНК даклад аб зьвышэньні пасеве ільну.

Вопыты паказваюць, што калі лён пасеяць, як толькі сьнег растане, нават па ўзбалай зямлі (калі яна ўвосень падрыхтавана), скажам, у красавіку месяцы (былі вопыты, калі сеялі 10 красавіка), дык лён дае ў паўтары—два разы больш ўраджай.

Больш таго, ёсьць ужо выпадкі, што лён сеюць на зіму, але сеюць так, каб ён ня ўзышоў увосень, а каб застаўся зімаваць пад сьнегам. Гэта павышае ўраджайнасьць і паляпшае якасьць ільнавалакна. Гэта адначасова спрыяе размеркаваньню працы ў сельскай гаспадарцы больш раўнамерна, бо збіраць рана насеньні лёну можна ў больш ранні тэрмін, талы, калі няма такой нагрузкі па ўборцы ўраджаю іншых культур.

Баюся, што мы і тут ня сьмела ідзем. Ну, вопытная станцыя мае прыклады, але я пытаюся, колькі вы на зіму, у гэтым годзе пасеялі? Гаворыць, што па БССР выкананая праграма ў 100 га. Па-мойму, мала. На гэтыя вопыты мы можам рызыкаваць, паколькі вопытная станцыя пякавае на справе вельмі добрая выпіска. Але я баюся, што і гэтыя 100 га не засеяны, толькі пляны выкананы. Трэба сьмялей у гэтай справе рухацца.

Справа ўгараньня агратэхнікі, новых мэтадаў вядзьвіцця сельскай гаспадаркі — гэта справа павінна, галоўным чынам, арганізоўвацца і правадзіцца нашымі навукова-дасьледчымі установамі. Яны павінны дапамагаць земельным органам і нашай партыі актывізаваць кожнага члена партыі ў гэтай справе, каб кожны член партыі і кожны калгасьнік аўладаў-бы агратэхнікай.

II. Дабіцца перамогі на фронце загатовак

Зараз аб загатоўках сельска-гаспадарчых прадуктаў. Пленум ЦК КП(б)Б прааналіз ход загатовак, а таксама работу загатоўчых органаў зусім нездавальняючай. На 10 сьнежня загатоўкі выкананы былі па БССР наступным чынам: па збожжазагатоўках на 50 проц. разам са аварогам насеннай пазыкі; па ільну — толькі на 27,8 проц., па ялцы — на 20,8 проц. Плян бульбазагатовак мы выканалі на

71,8 проц., па мясу квартальны плян 4-га кварталу мы выканалі толькі на 45,9 проц. Прычым, як звычайнае зьявішча, па ўсіх відах загатовак адстае аднасобны сэктар. Напрыклад, па мясу калгасы выканалі 60 проц., калгасныя таварныя фэрмы — таксама 57—60 проц., аднасобнікі — 20 проц., а калгасьнікі — 8 проц.

Я, таварышы, павінен напомніць, што справа загатовак зьяўляецца цэнтральнай гаспадарча-палітычнай задачай.

Вы ведаеце, што збожжафуражны балянс адыгрывае асноўную ролю ў народна-гаспадарчым плане. Таму можаце сабе ўявіць, як мы выглядаем у БССР, калі мы параўнаўча невялікія пляны свае, пляны зусім рэальныя, меншыя за летаньнія, па збожжазагатоўках усяго выканалі на 50 проц., па бульбе таксама ня выканалі. Праўда, мы адгрузілі бульбу Ленінграду, выканалі цалкам плян адгрузкі. Гэта добра, але справа на гэтым не [illegible]

Чаму цягнемся ў хвасьце?

Чаму мы адстаем у выкананьні плану загатовак? Трэба даць просты адказ на гэта запытаньне. Пленум ЦК прыняў, што асноўнай [illegible] — гэта наша слабая работа кіраўніцтва на місу, гэта недахопы нашай арганізацыйнай працы і недаўмаць цэлага раду выпадкаў у рацэ арганізацый простай палітычнай недаацэнкі значэньня і важнасьці выкананьня загатоўчых плянаў.

Многія лічылі, што, мо, пляны ў гэтым годзе лёгкія і таму самі па сабе выканаюцца, гэта значыць разьвіваліся самацёчныя, яўні апартуністычныя настроі. Гэтыя людзі забылі, што за збожжа трэба весьці бязьлітасную барацьбу з кулакамі, забылі, што загатоўкі праходзяць на ўмовах абвостранай клясавай барацьбы і шалёнага супраціўленьня, якое аказваюць ворагі кулацтва і ўсялякі антысавецкіх, контрэвалюцыйных элементаў і што абавязкам кожнага камуніста, сельскагаспадарчыка і раённага працаўніка заключаецца ў тым, каб па-бальшавіцку дамаць супраціўленьне клясовага ворага і ачысьціць рады партарганізацыі ад людзей, якія зрастаюцца з кулаком.

Вось гэта — асноўнае, бо эканамічныя падставы, як я ўжо паказаў гэта лічбамі, у нас ёсьць для свайчасовага выкананьня перагнаўча лёгкіх плянаў загатовак. І так, на траба забываць таго, што загатоўкі ў гэтым годзе праходзяць на ўмовах абвостранай клясавай барацьбы на вёсцы. Кулацкія антысавецкія элементы арганізуюць просты сабатаж загатовак па ўсіх культурах. А многія вясковыя камуністы, дый ня толькі вясковыя, але і многія гарадзкія камуністы трапілі ў палон кулацкіх настроеў, страцілі клясавую пільнасьць, а некаторыя нават проста самкнуліся з кулакамі, з антысавецкімі элементамі і пад фальшывымі сьцягамі нібыта абарны інтарэсаў калгасьніка, па сутнасьці дапамагаюць кулаком сабатаваць плян збожжазагатовак.

Фактаў разлажэньня, змычкі з кулаком з боку пасобных камуністаў ёсьць шмат. Вось на гэтым тыдні ў часе пленуму была апублікавана пастанова ЦК КП(б)Б па жлобінскай

Актывізацыя антысавецкіх элемэнтаў

Мы маем і такія выпадкі, калі ў некаторых раёнах былыя людзі, аж да былой клітіні, у адным раёне БССР займаюцца простай контрэвалюцыйнай работай. Праўда, гэтыя групы невялікія, пусьцячныя, ня маюць за сабой хоць-бы якой-небудзь апоры, людзі, адмыўшыя свой век, былыя людзі, але гэта кажа аб тым, што рэшткі разьбітага клясавага ворага прабуюць тыя ці іншыя шляхам арганізацыі, уставіць палку ў колы, сарваць збожжазагатоўкі і г. д.

Мы маем выпадкі, калі трацкісцкія элементы таксама сям-там паказваюць свае контрэвалюцыйныя вушы. Вось, напрыклад, нядаўна выкрыта ў Мазыры контрэвалюцыйная трацкісцкая група. Гэта справа ўжо разьбіралася ў нас у ЦК КП(б)Б і ПКК. ЦКК пастанавіла 9 чал выгнаць з партыі, як яўных контрэвалюцыянераў, трацкістаў. Іх можна назваць па прозьвішчы: Готліб, Эдэльман — арганізатар і ідэйны кіраўнік, нарэшце, аб сакратары Жлобінскага РК Жыракове. Гэта характэрная справа. Аказваецца, справа даказана ў райне да таго, што [illegible] менш за усіх выканаў плян збожжазагатовак, загатоўкі ільну дрэнна, рад кулакоў адноўлены ў выбарчых правох, замаль больш чым на ўсіх раёнах. І гэта ўсё тлумачыцца тым, што жонка, якая зьвязана з кулакамі, падшэнчула, дый іншыя прычыны зрушылі гэтага чалавека з клясавых пазыцый. Ён узмоцнена займаецца адпаўленьнем у выбарчых правох пешкага Міхайловскага. Аказваецца, гэта проста дзядзька жонкі, а Міхайлоўскі пасьля разваленьні ганадзяў мясам, да разваленьні па сутнасьці быў памочнікам.

Калі мы на бюро слухалі яго, то пыталіся: раскажы, ты-ж член ЦК КП(б)Б, ты быў у Чырвонай арміі і нават на фронтах, як гэта ты пашаў пад уплыў кулацкіх элементаў, як гэбе апутала жанчына, якая зьвязаецца сваячкай гэтых кулацкіх элементаў? Ён не зразумеў гэтых пытаньняў і ўсё адмаўляў, у той час, калі дакументальна даказана, што ён займаўся адпаўленьнем гэтых кулакоў у выбарчых правох, што гэтыя кулакі былі ў калгасе пад яго апекай і г. д.

Бюро ЦК пастанавіла і пленум гэта пацьвердзіў: вывесьці яго са складу члена ЦК, зьняць з работы сакратара РК і пытаньне аб партыйнасьці перадаць на разгляд у ЦКК.

Аб чым гаворыць гэты факт? Аб тым, што ў нас рад людзей страцілі клясавую пільнасьць. У радзе выпадкаў простым чынам змыкаюцца з клясавым ворагам, з кулаком. Ці можна ад гэтых людзей чакаць баявой работы, якая патрабуецца ад кожнага бальшавіка на важнейшым фронце сацыялістычнага будаўніцтва, на фронце збожжазагатовак, сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі? Ніяк нельга чакаць ад гэтых людзей сацыялістычнай работы.

Шмат прыкладаў ёсьць і па іншых раёнах, якія гаворыць аб тым, што і ў нас ёсьць тое, што было ў Арэхаўскім раёне на Украіне.

Гэта мы павінны зрабіць чаго-б гэта не каштавала.

Што практычна азначае для нас выкананьне гэтых задач? Гэта азначае, што мы ўзмоцнім харчовую базу работай класы, пазбавім снабжэньне рабочых. Гэта азначае, што па выкананьні дзяржаўных загатовак мы зможам разгарнуць савецкі гандаль, больш арганізаваць прыток сельска-гаспадарчай прадукцыі, на гарадзкія савецкія рынкі.

Без выкананьня плану мы гэтага дабіцца ня зможам.

Калі мы гэтага ня зробім, то будзем дрэнная арганізацыяй, дрэнным бальшавікамі.

БССР можа выканаць свае пляны ў тэрмін і яна абавязана выканаць. Рабочыя арганізацыі ніколі вялікую адказнасьць перад партыяй, перад дзяржавай за выкананьне гэтых у тэрмін. Гэта зьявіцца выпрабаваньнем бальшавіцкай дасьцільнасьці кожнага члена партыі, кожнай ячэйкі, райкома РВК і г. д.

Так стаіць справа з пытаньнем загатовак, якое разглядзелася на пленуме ЦК КП(б)Б.

Больш рэвалюцыйнай пільнасьці!

Усё гэта разам узятае патрабуе мабілізацыі пролетарскай пільнасьці, ды ажыцьцяўленьні галоўных задач нашай партыі і пролетарскай дзяржавы.

Каб выканаць пляны загатовак сельска-гаспадарчых прадуктаў, мы ў першую чаргу павінны быць клясавы ўсёрасныя, быць сапраўднымі бальшавікамі, бачыць пралесы абвастрэньня клясавай барацьбы, даваць рашучы адпор кулацкаму супраціўленьню, а таксама тым, хто патурае кулаком. Бальшэвіцкая змятацца з усякімі ліберальнымі, гнілымі адносінамі да выкананьня важнейшых заданьняў партыі і ўрада, тым больш трэба змятацца з тымі, хто змыкаецца з кулаком, хто нападае на яго ў палон.

Гэта гарантуе нам выкананьне плану загатовак у вызначаным пленумам ЦК тэрміны.

А справа так стаіць. Мы павінны да 25-га сьнежня скончыць плян збожжазагатовак. Мы павінны 25 сьнежня скончыць плян бульбазагатовак і на 90 проц. да 1 студзеня 1933 году выканаць плян ільназагатовак па ільнавалакну.

III. Перабудова масавай школы і ВНУ

Пленум адзначыў работу НК Асьветы, НКЦяжпрому, НКЛесгаму, НКземлеробства, НКСнабжэньня і іншых установаў, пад ведамам якіх ёсьць вышэйшыя навучальныя установы, — нездавальняючай у галіне практычнага ажыцьцяўленьня пастановаў ЦК УсесКП(б) аб перабудове пачатковай школы і ВНУ.

Работа па перабудове масавай школы і ВНУ праходзіць слаба. Гэта трэба адкрыта сказаць.

Напрыклад, з праграмамі справа стаіць ня зусім добра. Спазьняюцца. Зьмест праграм нездавальняючы. Часта ў школах, у тэхнікумах і ў ВНУ заняткі пачынаюцца, а праграмы яшчэ няма.

Сур'ёзна пытаньне стаіць аб падрыхтаванасьці да новага набору ў нашы вышэйшыя навучальныя установы і тэхнікумы.

Мы вынесьлі пастанову не выклікаць новага набору ў вышэйшыя навучальныя установы да таго часу, пакуль адпаведныя наркаматы ці цэнтральныя установы не падрыхтуюць жылой плошчы (інтэрнацкай) і

Школа патрабуе сталага падручніка

Пару слоў скажу аб падручніках. Мы абмеркавалі пытаньне аб масавай школе, гаварылі аб праграме, гаварылі аб падручніках.

Уся рабочая клясса, уся партарганізацыя г. Менску асабліва павінна справе работы масавай пачатковай школы надаць выключную ўвагу і асабліва пытаньню падручнікаў.

Чаму? На першы погляд здаецца, што гэта маленькае пытаньне, ці варта аб ім на актыве гаварыць, ну, падручнік, лемантар для дзіцяці — вось яшчэ вялікая справа!

Аднак, гэта вельмі сур'ёзная справа. Мы часта, па сутнасьці, калечым нашых дзяцей на тых гора-падручніках, якія ў нас ёсьць, прычым угнаем у вялікую страту нашу пралетарскую дзяржаву тым, што кожны год друкуем ня менш, як 2 мільёны падручнікаў і апошніх не хапае, ды ў дадатак яны яшчэ нікуды нягодныя.

Мы ў БССР кожны год пішам новыя падручнікі. Што ні год, то новы падручнік на адной і той-жа дысцыпліне. А што-ж робіць з тымі, што ў мінулым годзе напісаны? У макулатуру здаюць. Прычым ніякай сувязі і пасьлядоўнасьці паміж падручнікамі аднаго году навучаньня і другога году навучаньня вы не ўстановіце. Так што, калі дзіця хадзіла ў першую клясу, за лета што-небудзь забыла, дык яно ня можа паўтарыць гэтага па падручніку ў пачатку наступнага году, адразу садзіць яго за іншы падручнік.

Гэта бяда ня толькі БССР, але і РСФСР, усіх рэспублік, што мы кожны год выпускаем па 10 млн. падручнікаў і толькі на адну зіму, прычым падручнікі асобныя для кожнай клясы навучаньня.

Многія з вас вучыліся арытмэтыцы па Малініну і Буроніну ці Верапчагіну, або геамэтрыі і альтэбры па Кіюлёву. Гэта былі падручнікі, па якіх вы ў першым годзе вучыліся і кажналі навучэньне па іх. Прычым, калі вы скончылі вучобу, падрасла сястрыца, ёй перадалі, потым браток падрасьце, яму перадалі — навучалася па адзнаму падручніку ўся сям'я. Пры гэтым падручнік Малініна і Буроніна ня так ужо горшы за падручнік тав. Лойка. Я не хачу падрыўдзіць тав. Лойка, але падручнік Верапчагіна па арытмэтыцы таксама ня горшы за падручнік тав. Лойка.

Чаму-б нам ня ўзяць гэты падручнік Верапчагіна, перарабіць на савецкі лад і карыстацца ім? Што, ад гэтага наш гонар пацярпіць, пацерпіць наш розум, калі мы будзем вучыцца арытмэтыцы па падручніку Верапчагіна ці Малініна і Буроніна? Мне могуць сказаць, што ў гэтых падручніках напісана, што адзін купец прадаў за столькі і столькі другому купцу адзін беркавец жыта, а другі купец купіў за столькі і столькі рублёў тавару, а ў нас, мо', зараз купцоў няма. Ну, добра. Дык давайце ў гэтым-жа падручніку нашым замест адзін купец прадаў другому — адзін камэрсант Хвоя прадаў другому камэрсанту Іванову ці бедзьдзярэ гандлюру Сідарову такія і такія тавары — вось і ўсё. (Сьмех).

Ці магчыма гэта?

(Лойка з месца: «Не немагчыма»).

А па-мойму, магчыма і трэба гэта зрабіць. У нас забываюць, што мы за апошнія пяць год, ведаеце, колькі ў БССР напісалі падручнікаў — 7.882 тыс. (Шум).

(Голас — «За які час?»).

За апошнія пяць год. А вучыцеся у нас у 1932 г. 896 тыс. (Сьмех).

Дык вось, бачыце, выходзіць, што мы напісалі столькі падручнікаў, што калі іх разьмеркаваць на кожнага вучня, дык будзе па восем з паловай падручніка на вучня. (Сьмех). Гэта факт.

А ці ва ўсіх школьніках зараз ёсьць падручнікі, хаця-б па аднаму? Не, кажа. У нас можа быць, максымальна, адзін падручнік на двух або адзін на трох. Чаму гэта так? Таму, што кожны год для кожнай групы ці вучэбнай новыя падручнікі.

А ці ва ўсіх школьніках зараз ёсьць падручнікі, хаця-б па аднаму? Не, кажа. У нас можа быць, максымальна, адзін падручнік на двух або адзін на трох. Чаму гэта так? Таму, што кожны год для кожнай групы ці вучэбнай новыя падручнікі.

Мільёны падручнікаў—у макулятуры

Я ўжо не гавару аб якасьці гэтых падручнікаў — дай бог многа лепшага, хаця яны і нанава напісаны і сем раз перапісаны. (Сьмех).

А дзе-ж астатнія гэтыя 7 млн.? У кошыках, у макулятуры дзяжаць, а вы ведаеце ва што гэта абыходзіцца дзяржаве — гэта высьлікае па сутнасьці папяровы голад.

Мы гаворым — паперы не хапае, ды такая краіна можа дабіць столькі паперы, колькі мы зьнішчаем кожны год! Не сакрэт, што некаторыя людзі дагаварыліся да таго, што, бачыце, зусім ня трэба падручнікаў, бо гарадзкі і сем партыйнай рашчэ аскажана і мэтад праектаў рашчэ асужан. Гэта «лявацкія» заскокі, якія яшчэ характарызуюцца і тым, што асобныя людзі лічылі, што магчыма пасуд школу ліквідаваць і стварыць так званую школу-фабрыку. Вось да чаго гэта прыводзіць. Замест таго, каб напрацаваць над складаньнем добрага стабільнага (пастаяннага) падручніка, людзі парапылі, што зусім непатрэбны падручнікі і школы, а калі гэта не ўдалося, то друкуюць для кожнай групы асобныя падручнікі на адну зіму.

Шкодная замена падручнікаў некаторымі людзьмі матывуецца тым, што, бачыце, кожны год ёсьць шмат новага ў палітыцы і ў сапраўднасьці, ці ў [illegible] сьвеце і з ільном.

Чаму мы адстаем у выкананьні плану загатовак? Трэба даць просты адказ на гэта запытаньне. Пленум ЦК прыняў, што асноўнай [illegible] — гэта наша слабая работа кіраўніцтва на місу, гэта недахопы нашай арганізацыйнай працы і недаўмаць цэлага раду выпадкаў у рацэ арганізацый простай палітычнай недаацэнкі значэньня і важнасьці выкананьня загатоўчых плянаў.

Многія лічылі, што, мо', пляны ў гэтым годзе лёгкія і таму самі па сабе выканаюцца, гэта значыць разьвіваліся самацёчныя, яўні апартуністычныя настроі. Гэтыя людзі забылі, што за збожжа трэба весьці бязьлітасную барацьбу з кулакамі, забылі, што загатоўкі праходзяць на ўмовах абвостранай клясавай барацьбы і шалёнага супраціўленьня, якое аказваюць ворагі кулацтва і ўсякіх антысавецкіх, контрэвалюцыйных элементаў і што абавязкам кожнага камуніста, сельскагаспадарчыка і раённага працаўніка заключаецца ў тым, каб па-бальшавіцку дамаць супраціўленьне клясовага вораге і ачысьціць рады партарганізацыі ад людзей, якія зрастаюцца з кулаком.

Вось гэта — асноўнае, бо эканамічныя падставы, як я ўжо паказаў гэта лічбамі, у нас ёсьць для свайчасовага выкананьня перагнаўча лёгкіх плянаў загатовак. І так, на траба забываць таго, што загатоўкі ў гэтым годзе праходзяць на ўмовах абвостранай клясавай барацьбы на вёсцы. Кулацкія антысавецкія элементы арганізуюць просты сабатаж загатовак па ўсіх культурах. А многія вясковыя камуністы, дый ня толькі вясковыя, але і многія гарадзкія камуністы трапілі ў палон кулацкіх настроеў, страцілі клясавую пільнасьць, а некаторыя нават проста самкнуліся з кулакамі, з антысавецкімі элементамі і пад фальшывымі сьцягамі нібыта абарны інтарэсаў калгасьніка, па сутнасьці дапамагаюць кулаком сабатаваць плян збожжазагатовак.

Фактаў разлажэньня, змычкі з кулаком з боку пасобных камуністаў ёсьць шмат. Вось на гэтым тыдні ў часе пленуму была апублікавана пастанова ЦК КП(б)Б па жлобінскай

Выхаваць пакаленьне, узброенае навукай

Гэта сьвяцільніка, гэта раструба народнага добра, установка на тое, каб кожны год мяняць падручнікі. Гэта установка ня наша.

Нам патрэбна стабільнасьць падручнікаў, стабільнасьць падручнікі больш-менш пастаянымі—вось асноўная установка. Прычым тыя падручнікі, што мы стварылі да гэтага часу, трэба перагледзець, праверыць, лепшыя замацаваць.

Калі яшчэ ня ўсе старыя падручнікі зьнішчаны па некаторых прадметах, трэба перагледзець старыя падручнікі, выправіць іх на савецкі лад і скарыстаць.

Апрача таго, трэба лепшых аўтараў арганізаваць, каб яны пісалі. Дайце нам аўтара, каб мы хоць ведалі, каго трэба крытыкаваць, калі гэта трэба. (Сьмех). А ў нас апрыч лязецца так, што складзе падручнік цэлая брыгада. Гэта ня дрэнна, наадварот, карысна, але трэба ставіць на падручніку прозьвішча яго аўтараў. Мы маем многа падручнікаў такіх, што ня ведаеш, хто зьяўляецца іх аўтарам.

Я гавару аб усім гэтым, праверыўшы на асабістым вопыце. У мяне дома ёсьць унучка, і я бачу, як калечаць нашых дзяцей на семастрыных падручніках. Амаль кожны дзень дзіця прыходзіць і гаворыць, што ёй патрэбен новы падручнік, бо той, які купілі ўчора, сёньня ўжо забракован, дый наогул нікуды ня варты.

Я гэта пытаньне закранаю тут як важнейшае пытаньне ў справе выхаваньня мільёнаў нашага мацадога пакаленьня. Наша пакаленьне павінна стаяць вышэй нас на цэлую галаву па ведах, а яно будзе стаяць вышэй нас толькі тады, калі мы будзем вучыць нашых дзяцей пісьменнасьці і ўсялякім навукам на добрых падручніках, калі ў нас ня будуць займацца ў справе выданьня падручнікаў сьвістальскай. У нас не хапае паперы, дый ня хопіць, калі мы кожны год практыкуемся на складаньні падручнікаў. Досыць гэтых практыкаваньняў над падручнікамі! Трэба даць падручнікі больш-менш пастаянныя.

Пытаньні нацыянальнай палітыкі

Зараз некалькі заўваг аб пытаньні нацыянальнай палітыкі. Я хачу тут зьвярнуць увагу на наступнае: нам трэба ва ўсёй нашай партыйнай арганізацыі па-сапраўднаму, пабальшавіцку заняцца справай беларусізацыі і фармаваньнем кадраў з карэннага насельніцтва.

Чаму я гэта пытаньне зьнімаю на партактыве? Справа ў тым, што ў нас за апошні час трапляцца выпадкі яўна ваяўкалізаторкаў вага паралку—з аднаго боку і нацыяналістскія р

Вынікі сьнежаньскага пленуму ЦК КП(б)Б

Даклад тав. ГАЛАДЗЕДА на сходзе Маскага партактыву

ПРАЦЯГ

IV Аб ачыстцы партыі

Цяпер, таварышы, аб чыстцы партыі. Учора ў газетах была апублікавана пастанова ЦК УсеКП(б) аб правядзеньні генэральнай чысткі радоў нашай партыі на працягу 1933 г. і адначасова закрыт прыём у кандыдаты і пераход з кандыдатаў у члены партыі. Наогул, закрыт прыём у партыю.

У «Правде» надрукавана перадавая па гэтым пытаньні. Я-б хацеў, каб усе прачыталі перадавую вельмі ўважліва, бо яна дае арыентоўку ў тым, як мы будзем падыходзіць пры чыстцы партыі.

Чыстка партыі—гэта палепшаньне нашых радоў, гэта ачыстка партыі ад элементаў, якія разлажыліся, перарадзіліся і прымазаліся.

Папярэдняя чыстка, якія праводзіліся ў нашай партыі, паказалі, што гэта ўмацаньне рады партыі, гэта бальшавізуе і ачышчае не ад усякіх элементаў, якія прымазаліся, разлажыліся, а такія ў нас ёсьць.

Кантрольныя камісіі павінны на працягу 1933 г. прарабіць для нашай партыі вялікую, адказную, пачесную работу, работу, якая завострыць зброю нашай партыі, падняце дысцыпліну, узьніме палітычны ўзровень.

Напэўна і камсамол павінен будзе пасьледаваць за партыяй і таксама праведзець сваё рады. У камсамоле таксама ёсьць элементы, якія прымазаліся, разлажыліся, ёсьць элементы, якія зраслися з абываталямі, з кулакам.

Часам у якой-небудзь камсамольскай арганізацыі раёну, мястэчка пачне правесьці мяжу, дзе канчаецца гандляр і дзе пачынаецца камсамолец. Бацька яшчэ і зараз гандлюе, а сын ці дачка—член камсамолу і сваім камсамольскім пасьведчаньнем абараняе бацьку ад падаходнага падатку. Бываюць такія выпадкі. Такіх людзей проба вычысьціць. Пралезьлі ў камсамол і заможна-кулацкія элементы, іх трэба выкінуць.

Між тым трэба не забываць наступнае, што як у рады партыі, у камсамол пралезла шмат людзей з абывательскага асяродзьдзя. Вы ведаеце, што ў сувязі з паширэньнем сацыялістычнай выворчасьці і ў сувязі з ліквідацыяй буйных, якія ў нас абываюцца, у нас ліквідавалася беспрацоўе, не хапае рабочых рук. Такім чынам папаўняецца рабочая клясa за кошт вёскі, мястэчка і г. д., а часта пралазяць на заводы і на пабудовы і клясава-варожыя элементы—кулакі і інш. І гэтыя людзі, пралазяўшы год-два на прадпрыемствах, пралазяць у рады партыі і ў камсамол, бранёюцца кніжкай ударніка, партыйнымі білетамі і жывуць сабе, хоць яны засталися са сваім нутром. Ёсьць і многа такіх, якія прымазаліся.

Таму пытаньне ачысткі радоў нашай партыі ад элементаў, якія разлажыліся, перарадзіліся, прымазаліся, ад кар'ерысцкіх элементаў, гэта пытаньне—самае актуальнае, самае баявое. У такую партыю, якая налічвае 3.150 тыс. чалавек, могуць залезьці ўсякія элементы. Мы іх павінны выпаць.

Па-бальшавіцку змагацца за выкананьне пастаноў пленуму

Якія вывады мы павінны зрабіць з пастаноў пленуму ЦК КП(б)Б? Па-сапраўднаму вразумець гэтыя пастановы і выканаць іх. Выканаць пастанову па ўдарным ураджайнасьці—гэта значыць паказаць здольнасьць весьці бальшавіцкую барацьбу па выкананьні адной з важнейшых народна-гаспадарчых задач нашай пралетарскай краіны, бо сельская гаспадарка, не ўздым зьяўляецца адным з важнейшых момантаў народна-гаспадарчага разьвіцьця. Трэба падцягнуць узровень разьвіцьця сельскай гаспадаркі да ўзроўню сацыялістычнай індустрыялізацыі. Выканаць гэту пастанову, гэта значыць сапраўды праводзіць арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаньне калгасаў, г. зн. даць больш нашай пралетарскай дзяржаве хлеба, мяса, сельска-гаспадарчага сырцу і г. д. Вось што значыць выканаць пастанову аб ударным ураджайнасьці.

Выканаць пастанову аб сельска-гаспадарчых загатоўках, гэта значыць палепшыць снабжэньне рабочай клясы і усіх працоўных, а над гэтай задачай мы павінны працаваць не пакладаючы рук, г. зн. паказаць, што наша КП(б)Б, а пад яе кіраўніцтвам усе савецкія, гаспадарчыя органы па справе могуць па-бальшавіку весьці барацьбу з клясавымі ворагамі, ламаць іх супраціўленьне, да канца ліквідуючы кулацтва і антысавецкія элементы. Гэта значыць здолець па-гаспадарчаму вырашаць важнейшыя эканамічна-палітычныя задачы. Выканаць планы загатовак на ўстаноўленыя тэрміны, гэта значыць па-бальшавіку зламаць кулацкі сабатаж загатовак і вынесьці ВСФР у рады перадавых рэспублік нашага Саюзу. А мы павінны гэта зрабіць ва што-б там ні стала, бо мы зараз знаходзімся ў хвасьце ўсіх іншых раёнаў Саюзу па выкананьні важнейшага заданьня партыі.

Выканаць пастанову, якую прыняў ЦК КП(б)Б аб школах і ВНУ, гэта значыць ажыцьцявіць важнейшыя дырэктывы нашай партыі аб нацыянальна-культурным будаўніцтве, памятаючы аб тым, што работа школы, ВНУ, тэхнікуму—гэта ёсьць сустрэчная і важнейшая частка ленінскай нацыянальнай палітыкі. Гэта значыць, што мы зможам ленін весьці барацьбу за новыя пралетарскія кадры, за выкананьне новага камуністычнага пакаленьня. Гэта значыць быць клясава пільнымі на ідэалёгічным фронце.

Ажыцьцявіць пастанову аб партыйна-масавай рабоце, гэта значыць навучыцца па-бальшавіку працаваць, працаваць метадамі бальшавікоў, а ня метадамі голага адміністраваньня і не апартуністычным самацёкам. Гэта значыць на справе ўмець узначальваць масы пры выкананьні задач па сацыялістычным будаўніцтве. Гэта значыць выхаваць кожнага члена ячэйкі, кожнага члена партыі і камсамольца, быць бальшавіцкім палітычным арганізатарам. Гэта значыць заваяваць клясавую цікавасьць кожнага камуніста ў вёсцы, умацніць баяздольнасьць нашых вясковых партыйных арганізацый, якія павінны ўзначальваць справу сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

Вось што значыць выканаць пастановы, якія прынёў пленум.

Дазвольце мне выказаць поўную ўпэўненасьць у тым, што Менская арганізацыя, як і раней, будзе перадавой, авангардняй арганізацыяй на выкананьні важнейшых задач на шлях бальшавіцкай партыі ў справе сацыялістычнага будаўніцтва. Менскія бальшавікі па-ранейшаму прыклад для ўсёй КП(б)Б. (Аплёдысмэнты).

Чакаем канкрэтнай бальшавіцкай справы

ВІЦЕБСК. Па канкрэтнай барацьбе за выкананьне дзяржаўных планаў загатовак надзвычай ясна праявяецца бальшавіцкая здольнасьць кожнага камуніста і яго ўменьне змагацца за генэральную лінію партыі. Гэта поўнасьцю пацьвярджаецца на вопыце загатовак па Віцебшчыне.

Віцебшчына адстае ў выкананьні плану збожжазагатовак. Гэта адставаньне асабліва ведапушчальнае, калі ўлічыць, што Віцебск—буйны пралетарскі цэнтр, дзе значна лепш стаіць справа з кадрамі і матар'яльна-тэхнічнай базай, чым у радзе іншых раёнаў.

У чым прычына буйнага прарыву ў збожжазагатоўках па Віцебшчыне?

Чаму Віцебскі раён выканаў толькі 75 проц. плану па збожжы, 44,1 проц. па льнавалакну і 88 проц. па мясе?

Адной з прычын гэтага базумоўна зьяўляюцца гнілыя ліберальныя адносіны роду партыйных і савецкіх арганізацый Віцебшчыны да выкананьня плану дзяржаўных загатовак.

Больш таго. Пасобныя камуністы (кажуць іх камуністамі можна толькі ў двуёсьлях) — кіраўнікі сельсаветаў і калгасаў сабатуюць загатоўкі, а ў радзе выкажаў зьяўляюцца самі арганізатарамі кулацкага сабатажу.

Гэтыя людзі, прыкрываючыся партбілетам, на словах згаджаюцца з генэральнай лініяй партыі, а фактычна вядуць падрыўную кулацкую работу, дзіўную спаўзьлі з праце тарскіх клясавых пазыцый.

Да ліку такіх ворагаў з партбілетам, якія небясьпечней адкрытага ворага, можна аднесьці, напрыклад: старшыню калгасу «Камінтэрн», Шумнянскага сельсавету; камуніста Канаваленка, які займаўся яўным антыкамуністам партыі і ажазаў простае супраціўленьне выкананьню плану збожжазагатовак па сваім калгасе; Казлоўскага — старшыню Елагінскага сельсавету — абіраннуў кулацка-заможныя гаспадаркі і яго прыняў кіяхіх мер, каб выканаць планы; Пудзікава — старшыню калгасу імя 1-га мая, Старасельскага сельсавету, які ўгарта супраціўляўся загатоўкам.

Зусім зразумела, што пры такіх «кіраўніках» кулацка-заможныя гаспадаркі адчувалі сябе зусім свабодна і мелі поўную магчымасьць арганізаваць сабатаж загатовак.

Фармальна раённымі арганізацыямі ўсё было зроблена для таго, каб рангаваць загатоўкі. У сельсаветы і калгасы пасылаліся брыгады. Яны там нешта раблі, склікалі сходы, імкнуліся мабілізаваць калгасьнікаў і прапоўных адпасобнікаў. Аднак, справа пасоўвалася наперад надзвычай павольна. Пяцерашнія тэмпы не даюць ні ў якім разе гарантыі, што планы будуць выкананы своечасова.

Галоўнае заключаецца тут у тым, што работнікі, пасланыя на вёску, фармальна адносяцца да сваёх абавязкаў. Некаторыя з іх разглядалі пасылку на загатоўкі, як нейкую павінасьць, якую трэба выканаць. Сакратар парт'ячэйкі цагельні тав. Багатыроў, пасланы на загатоўкі ў Рудакоўскі сельсавет, самавольна пакінуў вёску і паехаў у горад. Ён лічыў для сябе зусім нармальным у тамі напружаны і адказны момант дэзэртаваць з фронту загатовак. Такіх дэзэртыраў і фармалістаў таксама трэба кваліфікаваць, як людзей, якія стаялі з клясавых пазыцый і здрадзілі партыі.

Зараз вінаватыя атрымалі па заслугах: Канаваленка, Пудзікаў, Казлоўскі і Багатыроў выключаны з партыі і адданы пад суд. Гэта павінна быць вялікай перасьцярогай для ўсіх тых таварышоў, якія пасланы ў вёску на загатоўкі.

Трэба дабіцца, каб кожны камуніст, пасланы ў вёску шчыра і самааддана працаваў над выкананьнем плану. Менш дэкларацыйнасьці, больш канкрэтнай бальшавіцкай справы, — вось патрабаваньне, якое пад'ятлена зараз кожнаму работніку на фронце загатовак.

А дэкларацыйнасьці, ажыцьцяўленьні якіх надзвычай многа. Вось, напрыклад, старшыня Шумнянскага сельсавету Фаміч, сакратар Старасельскай парт'ячэйкі Саламонін, старшыня Замостоцкага сельсавету Колатаў на нарадзе 24 лістапада выказвалі сусцэльны тэрмін і абавязаліся да 1 сьнежня скончыць здачу збожжа. Што-ж атрымалася на справе? Ленін за ўсё аб гэтым гаворыць лічбы. За 15 дзён Старасельскі сельсавет даў прырост збожжазагатовак на 0,7 проц., Шумнянскі — на 8 проц., Замостоцкі — на 3,1 проц. Чым інакш гэта назваць, як не апушчаньнем партыі?

* * *

Па Віцебскім раёне шалова загатовак прыпадае на адпасобны сэктар. Адпасобнікі выказалі плян дзяржаўных загатовак збожжа на 50,6 проц. Гэта лічба выразна сьведчыць аб тым, што не разгорнута барацьба за выкананьне плану адпасобнымі гаспадаркамі. Зусім невыстарчальна праводзіцца барацьба за спэкуляцыйны збожжа. Не адчуваецца патробнага націску на кулака і заможніка.

Толькі ў бальшавіцкай барацьбе за збожжа, у рашучым націску на кулацкую замож ную частку вёскі, у перамаганьні сабатажу — заруха пералому на вучастку загатовак па адпасобным сэктары.

* * *

Старасельскі і Рудакоўскі сельсаветы Віцебскага раёну, сабатуюць здачу збожжа. Партыйнае і савецкае кіраўніцтва гэтых сельсаветаў яўна патурае клясава-варожым элементам. Гэтыя сельсаветы зараз занесены на чорную дошку. Райспажыўсаюзу прапанавана спыніць завоз туды тавараў і ў працягу адного дня вывезьці з крам усе ітлучныя тавары. Для праверкі камуністаў Старасельскай і Рудакоўскай ячэек накіраваны выязныя партгрупкі, якім прапанавана праверыць у першую чаргу кіруючы склад арганізацыі.

Такая зусім правільная мера павінна знач на дапамагчы выкананьню плану загатовак. Кулацкі сабатаж павінен быць зломлен ва што-б там ні стала і ў самы кароткі тэрмін.

* * *

Учора адбыўся сход партактыву г. Віцебску, на якім сакратар ЦК КП(б)Б тав. Шарэнтовіч інфармаваў аб пастанове ЦК УсеКП(б) па даладу ЦК КП(б)Б і СНК БССР пра ход загатовак. Віцебскі гарком прызнаў памылкі, дапушчаныя ім у правядзеньні кампаніі. Асноўная памылка заключаецца ў тым, што партыйнае і савецкае кіраўніцтва своечасова не мабілізавала ўсю арганізацыю на барацьбу за выкананьне плану загатовак. Гарком узяў на сябе абавязак да 26 сьнежня скончыць загатоўкі. Чакаем канкрэтнай бальшавіцкай справы.

Міх. Л.

Пра загатоўкі масла, малака і сыру

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР і Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б

У адпаведнасьці з пастановай СНК СССР і ЦК УсеКП(б) за 19 сьнежня 1932 г. «аб загатоўках масла, малака і сыру» (газ. «Известия ЦИК СССР и ВЦИК» № 850 за 20 сьнежня 1932 г.) Савет Народных Камісараў БССР і ЦК КП(б)Б пастанаўляюць:

1. Скасаваць існуючую дагаворную (кантрактацыйную) сыстэму загатовак малака, масла і сыру і ўстанавіць у парадку падатку для ўсіх адпасобных гаспадарак і калгасных двароў, якія маюць кароваў, абавязковую дастаўку (здачу) малака дзяржаве па ўстаноўленых дзяржаўных цэнах.

2. Зацьвердзіць на 1933 г. наступныя нормы здачы малака асобных для адпасобных сялянскіх гаспадарак, асобных для калгасных двароў у калгасах, якія маюць малочна-таварныя фэрмы і асобныя для калгасных двароў у калгасах, якія ня маюць малочна-таварных фэрм (у літрах на адну карову ў год).

Раёны	Для адпасобных сялянскіх гаспадарак	Для калгасьнікоў, якія маюць МТФ	Для калгасьнікоў, якія маюць МТФ
I ГРУПА:	250	160	120
1. Лёзьнянскі			
2. Менскі			
3. Слуцкі			
4. Віцебскі			
5. Сіроцінскі			
6. Гомельскі			
7. Жлобінскі			
8. Аршанскі			
9. Горацкі			
10. Мсьціслаўскі			
11. Магілеўскі			
12. Сененскі			
13. Полацкі			
14. Пухавіцкі			
15. Бабруйскі			
II ГРУПА:	180	120	85
1. Заслаўскі			
2. Дзяржынскі			
3. Крупскі			
4. Талачынскі			
5. Быхаўскі			
6. Капыльскі			
7. Крычаўскі			
8. Парыцкі			
9. Ч.-Слабодзкі			
10. Бешанковіцкі			
11. Дубровенскі			
12. Чавускі			
13. Касьцюковіцкі			
14. Клімавіцкі			
15. Гарадоцкі			
16. Шклоўскі			
17. Брагінскі			
18. Дрысенскі			
19. Вузьдзенскі			
20. Лагойскі			
21. Смалявіцкі			
22. Барысаўскі			
23. Рагачоўскі			
III ГРУПА:	125	80	60
1. Церахаўскі			
2. Клічаўскі			
3. Плешчаніцкі			
4. Пранойскі			
5. Чачэрскі			
6. Чэрвеньскі			
7. Рэчыцкі			
8. Сіроцінскі			
9. Чашніцкі			
10. Чэрыкаўскі			
11. Б.-Кашалёўскі			
12. Веткаўскі			
13. Асіповіцкі			
14. Бярэзінскі			
15. Уваравіцкі			
16. Асьвейскі			
17. Мазырскі			
18. Расонскі			
19. Ельскі			
20. Вушацкі			
21. Лепельскі			
22. Бяльніцкі			
IV ГРУПА:	100	60	40
1. Нараўлянскі			
2. Чырвонапольскі			
3. Бягомльскі			
4. Жыткавіцкі			
5. Лельчыцкі			
6. Пятрыкоўскі			
7. Тураўскі			
8. Хойніцкі			
9. Лоеўскі			
10. Камарынскі			
11. Любаньскі			
12. Глускі			
13. Карманскі			
14. Старобінскі			
15. Ст.-Дарожскі			

3. Устанавіць для малочна-таварных фэрм і для агрэгаваннага стада калгасаў пасобны плян здачы малака дзяржаве па наступных нормах на 1933 г. (у літрах з карвы ў год).

	МТФ і агрэгаванае стада калгасаў.
I група	— 550
II група	— 500
III група	— 450
IV група	— 300

4. Устанавіць ва ўсіх раёнах БССР наступныя тэрміны выкананьня галавога пляну здачы малака МТФ і агрэгаванага стада калгасаў, адпасобнікамі і калгасьнікамі ў проц. ад гадавых норм, паказаных у арт. 2 і 3 гэтай пастановы.

I квартал	— 15 проц.
II квартал	— 35 «
III квартал	— 40 «
IV квартал	— 10 «

Даручыць Народнаму Камісарыяту Сакгаснабжэньня і Белкаапсаюзу ўстанавіць паместныя нормы здачы ў межах квартальных норм.

Абавязаць сельскія саветы не пазьней 10-га студзеня ўручыць кожнаму адпасобніку і калгасьніку, якія маюць кароваў, абавязацельствы на здачу малака, з указаньнем пункту здачы і з разьбіўкай галавой нормы здачы па месяцах, у адпаведнасьці з устаноўленымі для раёнаў квартальнымі планамі загатовак. Даручыць раённым выканаўчым камітэтам прасачыць за выкананьнем гэтага сельскімі саветамі. Абавязаць сельскія саветы весьці ўлік выкананьня платчыкамі сваіх абавязацельстваў.

Прапанаваць раённым выканаўчым камітэтам зацьвердзіць для раёну плян здачы МТФ і калгасамі разьмяркаваць і не пазьней 10 студзеня 1933 году давесьці да асобных МТС і калгасаў з агрэгаванымі стадамі.

6. У раёнах, дзе няма маслабойна-сыраварных заводаў, апрача цэльна-малочных раёнаў, выкананьне абавязацельстваў адпасобнікамі і калгасьнікамі робіцца тэхнічным шляхам з разьліку 1 кгр. масла на 25 літраў малака.

7. Абавязаць маслазаводы вярнуць здатчыкам малака адыходы ад перапрацоўкі малака на масла (абрат) у колькасьці: МТФ і калгасам з агрэгаваным стадам—50 проц. ад вагі здатага малака, іншым гаспадаркам — 35 проц. ад вагі здатага малака.

8. Загатоўку малака і масла ў парадку гэтай пастановы ўспасьці на Белмасаграм і Белкаапмалако, якія арганізуюць пры ёйку малака і масла ад здатчыкаў: першы — праз маслабойна-сыраварныя заводы, другі — праз сельскія спажывецкія таварыствы.

9. Абавязаць ярэктараў маслабойна-сыраварных заводаў, а таксама старшынь сельскіх спажывецкіх таварыстваў прыцягваць да крымінальнай адказнасьці асаб за спробы здаваць зьнітае і фальсыфікаванае (з прымешкамі) малако ў ліч выкананьня абавязацельстваў, устаноўленых гэтай пастановай.

10. Загатоўку малака ў цэльна-малочных раёнах праводзіць праз Белкаапсаюз.

11. Устанавіць з 1 студзеня 1933 году загатоўчыя цэны на малака, якое здаецца на масла-сыразаводы калгасамі, калгасьнікамі і адпасобнікамі ў разьмеры 15 кап. за літар.

12. Забараніць мясцовым органам улады, а таксама загатоўчым органам накладаць на калгасьнікаў, адпасобнікаў і МТФ абавязацельствы на здачу малака ў разьмерах, якія перавышаюць устаноўленыя гэтай пастановай параённыя нормы здачы, паніжаючы ўсе ліцкі малака пры акуратным выкананьні пляну здачы малака ў распарадкаваньні гэтых гаспадарак як для продажу, так і для асабістага спажываньня.

13. Тыя, хто ўхіляецца ад выкананьня абавязацельстваў па здачы малака ці масла дзяржаве па патрабаваньні загатоўчых арганізацый сельскімі саветамі прыцягваюцца да грашовага штрафу ў разьмеры рыначнага кошту невыкананай часткі абавязацельства, пры чым недавыкананая частка абавязацельстваў спаганяецца ў бясспрэчным парадку ў наступным месяцы звыш нормы гэтага месяца.

14. Даручыць упаўнаважанаму Камітэту Загатовак, упаўнаважанаму Народнага Камісарыяту саўгасаў і Народнаму Камісарыяту Земляробства на працягу двух дзён устанавіць плян па пасобных саўгасах і раёнах у месячным разрэзе.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. ГАЛАДЗЕД.

Сакратар ЦК КП(б)Б М. ГІКАЛО.

23 сьнежня 1932 г.

РАСОНЫ, СЯННО і СІРОЦІНА ЗАТРЫМЛІВАЮЦЬ СКАНЧЭНЬНЕ У ТЭРМІН ІЛЬНАЗАГАТОВАК

ЗЛАМАЦЬ КУЛАЦКАЕ СУПРАЦІЎЛЕНЬНЕ, РАЗЬБІЦЬ УШЧЭНТ ПРЫСЛУЖНІКА Ў КЛЯСАВАГА ВОРАГА

СПАКОЙНА ЖЫЛОСЯ „ІЛЬНЯКЫМ СПЭЦАМ"

(Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта)

Сіроцінская міжраённая кантора «Загат Ільну» абслугоўвае тры раёны: Віцебскі, Сіроцінскі і Бешанковіцкі. На недахват людзей кантора ня можа пасакрэцыцца. 12 чалавек спэцыялістаў і асм.-тэхнічнага персаналу сядзець у Сіроціне. Гэта апрача загатчыкаў пунктаў у другіх раёнах.

Спакойна жылося «ільняным спэцам». Ільну на пункт пастучае мала, а стаўкі ў спэцаў гарантаваныя—150-200-300 руб.

Прыёмшчыкі Марзьлян, Брэйдз, Лісіцін і Масарскі літаральна б'юць бакалушы—утраіх чацьвярых прымаюць адну фурманку. Так выконваецца дырэктыва ўраду аб перавозе прыёмачнага апарату на зьдзельную аплату.

Зусім ня дзіва, што пры такім становішчы рочаў Мерзьлякам і да іх падобным ня ма ніякай справы да таго ці выконваюцца загатоўкі, ці не, ці добрае валакно паступае на пункты.

А якасьць валакна з прычыны нядбайнай і ляпнай апрацоўкі — нізкая. Кастрацы лён ідзе ніжэйшай нумарамі. А ёсьць поўная магчымасьць атрымаць з яго сярэдні нумар — 8 або 9-ты.

Да 20 сьнежня раён павінен быў здаць 70 проц. галавога заданьня па ільнавалакне. Загатоўлена-ж 33 проц. Загатчык канторы Загатільну Загацкі мала турбаваўся аб арганізацыі загатовак. Апарат канторы сядзеў у мястэчку і чакаў, пакуль пачнуць валакно. Персанальнай адказнасьці за сельсаветы, за калгасы работнікі канторы не нясуць.

— Мы, бачыце, міжраённая кантора, якжа нам адказваць за сельсаветы ў адным раёне?

Ездзяць, гастраляюць загатлёнаўскія спэцы з Вулы ў Бешанковічы з Бешанковіч у Віцебск і г. д. Але ні адзін з іх нават і не ахоўваецца і раскрадаецца.

Кулак Лісецкі, пралезшы ў калгас «Бурлёва» (Расьнянскі сельсавет), сыстэматычна на займаецца раскраданьнем калгаснай маемасьці. Пры вобыску ў яго знойдзена 170 кгр. ільнавалакна. Па віне праўленьня ў калгасе «Заглажава» (Пустынскі сельсавет) згніла палова ільну.

Кулацкі сабатаж у некаторых сельсаветах падтрымліваецца нават самімі сельсаветчыкамі. Напрыклад, члены сельсавету з вёсак Чырвонае сяло, Сычова і Будка — Конанаў, Кавалёўскі і Касьцюшка абараняюць кулакоў і хаваюць у сябе іх ільнапрадукцыю.

Старшыня калгасу «Рабіць» Гамакоў пад уплывам кулацкай агітацыі не здае ільну, які ў калгасе ёсьць.

Пэртарганізацыя Сеньненшчыны павінна ўлічыць урокі апошніх дзён, разьбіць ушчэнт кулацкі сабатаж, ачысьціўшы калгасы і органы пралетарскай дыктатуры на вёсцы — сельсаветы — ад кулацкіх агентаў і перарадзіцца.

В. СТАЛЬНОЎ.

Кулакоў ня трывожылі

СЯННО. (Наш спэцкар.).

Апошняя пяцідзёўка дала зусім пазітыўны зрух у ходзе ільназагатовак па раёне. Гадавы плян выкананы на 23,8 проц. 7 проц. прыросту за апошнія 10 дзён.

Адставаньне раёну можна тлумачыць толькі тым, што да апошняга часу ільназагатоўкамі тут зусім не займаліся.

Цьвёрдыя заданьні кулацка-заможнымі гаспадаркамі выкананы ўсяго на 13 проц.; а пасобнымі сельсаветамі і таго менш — на Сіроцінскім сельсавеце на 8,1 проц., па Навасёлаўскім — 8,5 проц., Машчанскім — 1,8 проц. У Хатчанскім сельсавеце да сёньняшняга дня кулакоў зусім ня трывожылі, спагналі 0,38 проц. ільнавалакна і на гэтым паставілі крыжык.

Бястурботныя адносіны да ільназагатовак ва ўсю скарыстоўвалі кулакі і іх агенты.

Старшыня калгасу «Пясочнае» Аляксеў, ня выканаўшы сваіх абавязкаў перад дзяржавай, разьдзяліў лён паміж калгасьнікамі. У першую чаргу ён раздаў лён сваякам. У калгасе «Бярашова» па сёньняшні дзень лён не апрацоўвае. У калгасе Цялішча лён

Зараз вінаватыя атрымалі па заслугах: Канаваленка, Пудзікаў, Казлоўскі і Багатыроў выключаны з партыі і адданы пад суд. Гэта павінна быць вялікай перасьцярогай для ўсіх тых таварышоў, якія пасланы ў вёску на загатоўкі.

Трэба дабіцца, каб кожны камуніст, пасланы ў вёску шчыра і самааддана працаваў над выкананьнем плану. Менш дэкларацыйнасьці, больш канкрэтнай бальшавіцкай справы, — вось патрабаваньне, якое пад'ятлена зараз кожнаму работніку на фронце загатовак.

А дэкларацыйнасьці, ажыцьцяўленьні якіх надзвычай многа. Вось, напрыклад, старшыня Шумнянскага сельсавету Фаміч, сакратар Старасельскай парт'ячэйкі Саламонін, старшыня Замостоцкага сельсавету Колатаў на нарадзе 24 лістапада выказвалі сусцэльны тэрмін і абавязаліся да 1 сьнежня скончыць здачу збожжа. Што-ж атрымалася на справе? Ленін за ўсё аб гэтым гаворыць лічбы. За 15 дзён Старасельскі сельсавет даў прырост збожжазагатовак на 0,7 проц., Шумнянскі — на 8 проц., Замостоцкі — на 3,1 проц. Чым інакш гэта назваць, як не апушчаньнем партыі?

* * *

Па Віцебскім раёне шалова загатовак прыпадае на адпасобны сэктар. Адпасобнікі выказалі плян дзяржаўных загатовак збожжа на 50,6 проц. Гэта лічба выразна сьведчыць аб тым, што не разгорнута барацьба за выкананьне плану адпасобнымі гаспадаркамі. Зусім невыстарчальна праводзіцца барацьба за спэкуляцыйны збожжа. Не адчуваецца патробнага націску на кулака і заможніка.

Толькі ў бальшавіцкай барацьбе за збожжа, у рашучым націску на кулацкую замож ную частку вёскі, у перамаганьні сабатажу — заруха пералому на вучастку загатовак па адпасобным сэктары.

* * *

Старасельскі і Рудакоўскі сельсаветы Віцебскага раёну, сабатуюць здачу збожжа. Партыйнае і савецкае кіраўніцтва гэтых сельсаветаў яўна патурае клясава-варожым элементам. Гэтыя сельсаветы зараз занесены на чорную дошку. Райспажыўсаюзу прапанавана спыніць завоз туды тавараў і ў працягу аднаго дня вывезьці з крам усе ітлучныя тавары. Для праверкі камуністаў Старасельскай і Рудакоўскай ячэек накіраваны выязныя партгрупкі, якім прапанавана праверыць у першую чаргу кіруючы склад арганізацыі.

Такая зусім правільная мера павінна знач на дапамагчы выкананьню плану загатовак. Кулацкі сабатаж павінен быць зломлен ва што-б там ні стала і ў самы кароткі тэрмін.

* * *

Учора адбыўся сход партактыву г. Віцебску, на якім сакратар ЦК КП(б)Б тав. Шарэнтовіч інфармаваў аб пастанове ЦК УсеКП(б) па даладу ЦК КП(б)Б і СНК БССР пра ход загатовак. Віцебскі гарком прызнаў памылкі, дапушчаныя ім у правядзеньні кампаніі. Асноўная памылка заключаецца ў тым, што партыйнае і савецкае кіраўніцтва своечасова не мабілізавала ўсю арганізацыю на барацьбу за выкананьне плану загатовак. Гарком узяў на сябе абавязак да 26 сьнежня скончыць загатоўкі. Чакаем канкрэтнай бальшавіцкай справы.

Міх. Л.

Сельсаветы засьмечаны кулацкімі агентамі

ВУШАЧЫ. Апошняя пяцідзёўка дала вельмі нязначны зрух у ходзе ільназагатовак. На 20 сьнежня плян выкананы на 35,8 проц.

Рад сельсаветаў — Гарадзецкі, Чарапоўшчынскі, Зарачанскі, Усаўск., Заляпільскі і інш. — да гэтага часу не зрабілі крутога пералому ў рабоце. У гэтых сельсаветах рашучы націск на кулацка-заможныя гаспадаркі адсутнічае. На свайчасовае выкананьне плану здачы ільну не мабілізавана ўвага калгасьнікаў і прапоўных адпасобнікаў.

Апартуністычная бязьдзейнасьць старшынь сельсаветаў: Усаўскага — Смаргуна, Зарачанскага — Міцьвіна і Гарадзецкага — Шаршунова прывяла да таго, што цьвёрдазаданьні выкталі плян па валакне на 10-12 проц. і ільнаным семі — на 25-30 проц.

Ёсьць выпадкі, што старшыні некаторых сельсаветаў жаклісь з кулаком. Так, старшыня Зарачанскага сельсавету Міцьвін, Усаўскага — Смаргун страцілі класавую пільнасьць і сыстэматычна п'янствуюць з заможнікамі.

Загатчык канторы «Загатільну» тав. Квят ко, па прыкладу старшынь сельсаветаў, таксама бязьдзейнічае. Ён лічыт ня ведае як выконваецца заданьне кулацка-заможнымі гаспадаркамі. Работнікі райзагатільну клюпоць загатоўкамі з канцылярыі. На мясцох — у сельсаветах і калгасах — яны вельмі мала бываюць.

Пералічаныя факты з усёй выразнасьцю гаворыць аб тым, што пастанова пленуму ЦК КП(б)Б аб выкананьні 70 проц. ільназагатовак да 20-га сьнежня ня стала цэнтр увагі арганізацый раёну.

М. ФІЛІМОНАЎ.

За заслонаю „аб'ектыўных" прычын

(Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта)

Сакратар Расонскага райкому тав. Карчык перабірае ў памяці прычыны гапейнага адставаньня раёну ў ільназагатоўках і, нарэшце, успамінае:

— Бачыце, дарогу перад замаразкамі сканчвалі...

А вось і вынікі райконаўскай бястурботнасьці. На 15-га сьнежня на раёне было загатоўлена 14,4 проц. ільнавалакна, у тым ліку па калгасах МТС — 18,4 проц., іншых калгасах — 16,4 проц., па адпасобных гаспадарках — кантрактантах — 11,8 проц. і па цьвёрдых заданьнях — 7,8 проц.

Апошняя пяцідзёўка з 15 да 20 сьнежня дала прырост: па трасьце — 9,8 проц., па ільнавалакне — 1,5 проц. Раённы плян на 20 сьнежня выкананы на 21,1 проц.

Зараз раённыя арганізацыі схапіліся і заварушыліся, склалі рад апэратыўных троек, езьдзяць па сельсаветах, пацеюць на пасяджэньнях але спатыкаюць злосны сабатаж, арганізаваны кулацтвам і яго агентурай.

Стаўка райкому на «аб'ектыўныя» прычыны ў розных варыянтах надзвычай шырока распаўсюджана і ў ніхох — у калгасах, сельсаветах.

Калгас «Бяжэк», Сакавішчанскага сельсавету, засеяў 55 гэкт. ільну і павінен зараз здаць 32 тоны трасты, здаў жа... 1,58 тоны.

Прычыны? Старшыня калгасу Кунько іх мае:

— З транспортам дрэнна... Палёка... Адгружалі бульбу, цялегі, коні... Праўда, хоць коні выгрымаліся, але... аўса мала, хоць седа і добрае...

Так бытуецца апартуніст з партбілетам у кішэні ў пошуках аб'ектыўных прычын. Яму ўторыць прымацаваны да калгасу ад парт'ячэйкі Дземяненка.

Ну, а як з ручной апрацоўкай?

Раней аб гэтым ня думалі, толькі зараз пачалі рыхтавацца, печка ў сушыльні рамонтуецца з... 21-га сьнежня.

І ў той час, калі перад дзяржавай ня выкананы абавязацельствы і на дагэтую долю у калгасе разьмяркоўваюць лён нібыта «на лапці». Ці-ж гэта ня ярні прыклад кулацкага ўплыву на кіраўніцтва калгасу?

Авалёгічнае становішча і ў буйнейшым ільнаводчым калгасе «Чырвоная Сакавішча». Сеялася ільну 165 гэкт., трэба здаць 100,5 тон трасты, здана 23 тоны.

Старшыня калгасу «Чырвоная Сакавішча» Сільчанка высоўвае свае «прычыны».

— Коняй то мы маем 70 штук, але... калі-б санная дарога, а так паракоўная фурманка вязе толькі 15 пудоў...

Наколькі недарэчная гэта балбатня, відаць з таго, што шлях да ільназаводу — аўтамобільная шаша. Вядома падвезьці трасту да шашы, 2-3 кілёмэтры, перакласьці на большыя фурманкі і тады вазі па 30-40 пудоў на гарцы. На гэта не хапіла розуму ў людзей, якія фактычна зьяўляюцца агентамі кулака ў калгасе.

Аб тым, што ў гэтым калгасе кулак прылажыў сваю руку, гаворыць і такі факт — ураджай семі і частка трасты згноены, плян здачы ільнянога семі ў 105 цэнт. выкананы на 4 проц.

Заядлым кулацкім агентам выяўляецца і старшыня калгасу «Перамога», таго-ж Сакавішчанскага сельсавету, Габрукоў.

Да ўступленьня ў калгас Габрукоў меў цьвёрдае заданьне. З

ПЕРШАЕ ПАСЯДЖЭНЬНЕ БЮРО МІЖНАРОДНАГА АНТЫВАЕННАГА КАМІТЭТУ

САВЕЦКІЯ ДЭЛЕГАТЫ СУСТРЭЧАНЫ З ЭНТУЗІЯЗМАМ

ПАРЫЖ, 23. Учора адбылося першае пасяджэньне бюро міжнароднага антываеннага камітэту з удзелам савецкіх дэлегатаў т. т. Шварніка і Стаповай, якія былі сустэтканы рэшта дэлегатамі з энтузіязмам. Дэлегаты розных краін выступалі са справаздачамі аб праведзенай у іх краінах рабоце па ажыцьцяўленьні Амстэрдамскага кангрэсу і арганізацыі барацьбы супроць вайны. З вялікай прамовай аб задачах амстэрдамскага руху выступіў тав. Мюнцэнберг. Амэрыканскі дэлегат паведаміў, што антываенны кангрэс у паўночнай Амэрыцы адбудзецца 28 лютага ў Мантэвідэо. Антываенны ступень кангрэс адбудзецца ў Злучаных Штатах.

***

ЖЭНЭВА, 23. Пасьля даклада галяндскага і чэха-славацкага дэлегатаў выступіў доктар Багушэўскі, які паведаміў, што ў Польшчы, як глядзячы на ўрадавы тэрор, увялося стварыць антываенны камітэты ў Варшаве, Вільне, Лодзі і Кракаве. Англійскі дэлегат паведаміў, што ў Англіі ў лютым склікаецца антываенны зьезд. Бэн Кутуры адзначыў неабходнасьць антываеннай работы на прадпрыемствах і серод сялянства і спыніўся на рабоце, што праводзіцца сярэдзі рэвалюцыйных пісьменьнікаў і работнікаў мастацтва. Ён паведаміў, што ў студзені ў Страсбурґу зьбіраецца канфэрэнцыя французкіх і германскіх рэвалюцыйных пісьменьнікаў. Выступіўшы ад імя германскай лігі праў чалавека генерал Шэнаэ заявіў, што далучаецца да учасьніцтва Анры Барбюсам прапановы наслаць дэлегацыю на Далёкі Усход. Член французкай сацыялістычнай партыі, які прымаў удзел у кангрэсе, падкрэсьліў, што, ня глядзячы на прасьледаньне з боку партыйнага кіраўніцтва 120 сяцый і 5 дэпартаментскіх арганізацый французкай сацыялістычнай партыі далучыліся да рашэньняў кангрэсу.

З вялікай прамовай выступіў Мюнцэнберг. Ён спыніўся на ідэалёгічнай падрыхтоўцы новай імпэрыялістычнай вайны, якая праводзіцца буржуазіяй. Побач з фразамі аб абароне дэмакратыі і культуры,—сказаў ён—беспрацоўнаму заяўляюць: «Вайна—выхад з крызісу, вайна цябе накормець». Мюнцэнберг склаў плян антываеннай работы на першае паўгодзьдзе 1933 г.—скліканьне кангрэсу ў Англіі, каля фэрэнцыя ў Скандынаўскіх і Прыбальтыйскіх краінах, Балканскую і Шанхайскую канфэрэнцыі міжнароднага кангрэсу моладзі.

У канцы пасяджэньня выступілі японскія дэлегаты Сэн Катаяма і Міда.

БОІ ПАМІЖ БЕСПРАЦОЎНЫМІ І ПАЛІЦЫЯЙ У ГЛАЗГО

ЛЕНДАН, 23. Ул. кар. «Правды» паведамляе, што ўчора ў Глазго (Шатляндыя) адбылася 15-тысячная дэманстрацыя беспрацоўных, якая закончылася форменным сражэньнем з паліцыяй. На прадмесьці некаторага часу дэманстранты, ня глядзячы на забарону маршыравалі вакол будынку муніцыпалітэту з пяньнем «Чырвонага сьцяга» і крыкамі: «Мы патрабуем зімовай дапамогі».

Потым пачаўся мітынг. Расьсеяныя ў натоўпе ў бязьлікай польскасьці паліцэйскія сышчыкі прабавалі сарваць мітынг правакацыйнымі пасьменьнямі. Завязалася форменнае сражэньне. Узброіўшыся палкамі, каменьнямі і дубінкамі, беспрацоўныя сталі прасьледаваць сышчыкаў, якія ратаваліся бегствам у напрадмесьці Клейда. Пачуліся воклічы «Кідайце сышчыкаў у раку». Адному з сышчыкаў прышлося прыняць халодную ванну ў Клейдзе, другія былі збіты да страты прытомнасьці. Конная паліцыя атакавала беспрацоўных, але апошнія аказвалі супраціўленьне.

У часе сутычкі параненa 14 паліцэйскіх, пры чым некаторыя з іх цяжка. Дэманстранты атрымалі лёгкія параненьні.

Па заклику кіраўнікоў, дэманстранты зноў сфармавалі калёны і арганізавана разыйшліся па сваіх раёнах. Беспрацоўныя Эдынбурга, Іарншыру і Вэкфільда, а таксама Портсмута дабіліся выдачы асобай зімовай дапамогі.

Учора перад роспускам парляманту на каляднымі каникулы Лёйд-Джорж выступіў з крытыкай урадавых мерапрыемстваў, зьвязаных з беспрацоўем. Опынуўшыся на апошняй прамове Мацдональда, у якой прэм'ер заклікаў да частковай дабрачынасьці і вынаходніцтва саміх беспрацоўных, Лёйд Джорж назваў гэту прамову прызнаньнем ураду ў банкрутстве. Парлямант распушчан да 7 лютага. (ТАСС).

Запытаньне камдэпутата Дорыё ў палаце дэпутатаў

ПАРЫЖ, 23. Выступаючы з запытаньнем у палаце дэпутатаў камдэпутат Дорыё заявіў: «Урад Эрыё быў зьвергнуты затрудненьнямі, створанымі эканамічным крызісам унутры краіны і па-за межамі і, у прыватнасьці, валізарным абвастраньнем супярэчнасьцяй паміж буйнымі капіталістычнымі дзяржавамі. Становішча ўраду Эрыё было асабліва падарвана насьпяваючымі сацыяльнымі канфліктамі ўнутры краіны, якія прыводзяць у рух шырокія масы рабочых, сялян і сярэдніх клясаў».

Падкрэсьліўшы, што ўсе гэтыя затрудненьні ня зьнішчаны, Дорыё задае пытаньне: «Якая-к будзе пазыцыя новага ўраду ў пытаньні аб ваенных даўгох, калі Банкур заяўляе, што будзе весьці палітыку габінэту Эрыё? Пазыцыя ПАЗШ у пытаньні аб даўгох розна процілеглая пазыцыі французкай палаты дэпутатаў. Няма надзеі дабіцца вырашэньня таго пытаньня на аснове тэй плятформы, на якой стаіць палата дэпутатаў. Таму нямінуча далейшае абвастрэньне франка-амэрыканскага антаганізму. «Адначасова ўзьнікае і другое пытаньне—ці зьбераецца ўрад плаціць Англіі тое, у чым ён адмаўляе ПАЗШ? Ці праўда, што ўрад мяркуе накопчыць з даўгом Англіі, і такім чынам аплаціць франка-англійскі саюз, які прадстаўляе найбольш сур'ёзную пагрозу міру—найбольш буйныя прадпрыемствы міжнароднага імпэрыялізму?»

У далейшым Дорыё крытыкуе пазыцыю французкага ўраду на канфэрэнцыі па разбраеньні і пераходзіць да далёка-ўсходняй праблемы і да пытаньня аб франка-савецкіх адносінах. «Калісьці Банкур у артыкуле, апублікаваным у часопісі «Флюраль» пісаў,—заяўляе Дорыё,—што Японія—апошні прытулак рэакцыі супроць расійскай рэвалюцыі».

«Калі Японія канчаткова зацьвердзіцца ў сэрцы Азіі,—пісаў Банкур,—цык гэта будзе гістарычным фактам нязьмернага значэньня, які зьвяжыцца прычынай новай сусьветнай вайны». «Якія-ж будуць цяпер адносіны,—пытаецца Дорыё—новага габінэту да далёка-ўсходняй праблемы і да СССР?».

Перапоўны далей да ўнутраной палітыкі, Дорыё падаў малюнак глыбокага крызісу, якім ахоплена ўся гаспадарка краіны. Зьяўленьне Шэрона на пасту міністра фінансаў Дорыё ахарактарызаваў, як адзнаку надыходзячага ўзмацненьня націску на зарплату рабочых і служачых, як сыгнал да наступленьня на шырокія працоўныя масы пяцелышчыкаў падаткаў.

«Мы, камуністычныя дэпутаты,—заявіў Дорыё,—карыстаемся выпадкам, каб яшчэ раз пацьвердзіць сваю бязумоўную варожасьць якім-бы там ні было мерапрыемствам, што могуць павесьці да скарачэньня зарплаты, або да зьмяншэньня пэнсій. Мы з гэтай трыбуны яшчэ раз паўтараем патрабаваньні працоўных: мы будзем змагацца за 7-гадзінны рабочы дзень, за 40-гадзінны рабочы тыдзень з захаваньнем зарплаты, за страхаваньне ад беспрацоўя ў рамках закону, аб сапраўдным сацыяльным страхаваньні». (ТАСС).

ТРЫВОЖНАЯ ЗІМА Ў ПОЛЬШЧЫ

ВАРШАВА. З надыходам зімы буржуазная прэса Польшчы, асабліва сацыял-фашысткі «Роботнік», амаль у кожным нумары б'е трывогу з прычыны таго жудаснага становішча, у якім апынуўся мільённы масы беспрацоўных. Зразумела, польскія сацыял-фашысты, гэтыя верныя псы польскага капіталу, менш за ўсё клапоцяцца лёсам працоўных мас. Рэвалюцыйныя выступленьні, якія падобна вулкану выбухаюць у розных канцах краіны і якія патрасаюць асновамі фашысцкай дыктатуры,—вось што прымушае лёкаеў капіталу падымаць голас у «абарону» гэтых шырокіх галодных мас.

Армія беспрацоўных у Польшчы бязупынна на, кожны дзень павялічваецца. Нават сама фашысцкая прэса прызнае, што ў сьнежні кожны тыдзень колькасьць беспрацоўных павялічвалася на 10 тыс. з ліпім чалавек. Указваючы на фальшаваньне ўрадавай статыстыкі беспрацоўя, «Роботнік» ад 18 сьнежня піша:

«Паводле ўрадавай статыстыкі, беспрацоўе «зьменшылася з 360 тыс. у сакавіку г. г. да 147 тыс. у канцы кастрычніка. Галоўная-ж Статыстычная Управа ў канцы ліпеня 1928 г. падавала колькасьць занятых рабочых у польскай прамысловасьці ў 848.600 чал., а на 1 лістапада г. г. толькі 385.708 чал. Калі нават узяць тыя прадпрыемствы, якія ахоплены статыстыкай Галоўнай Статыстычнай Управы, дык,—зазначае «Роботнік»,—мы мелі б зараз 579.600 беспрацоўных, а не 187.677, як падае ўрадавая статыстыка Біржы працы».

Гэта катастрафічнае зьмяншэньне занятых рабочых у прамысловасьці паказвае, якую вартасьць мае ўрадавая статыстыка, як яна груба фальшуецца.

Треба зазначыць, што і сацыял-фашысткі «Роботнік» гаворыць толькі аб беспрацоўі сярод рабочых у прамысловасьці і ні словам не ўспамінае аб сельгасрабочых, батраках, сезонных рабочых, якіх зараз у Польшчы налічваецца звыш мільёну без працы.

Паводле офіцыяльных даных, зараз атрымліваюць урадавую дапамогу толькі 35 тыс. беспрацоўных. Калі прыняць урадавую статыстыку беспрацоўя за праўдзівую, дык і тады выявіцца, што ў Польшчы толькі кожны пяты беспрацоўны атрымлівае жабрачую дапамогу, а паводле даных «Роботніка» гэту жабрачую дапамогу атрымлівае толькі адзін з 16 беспрацоўных.

Як відочна, фашысцкая ўлада, каб ня несьці больш выдаткаў па ўтрыманьні беспрацоўных, перадала ўсю справу па дапамозе беспрацоўным так званым «грамадзкім камітэтам» (жабрачыная фашысцкая ўстанова). І што-ж аказваецца? Уся дзейнасьць гэтых «грамадзкіх камітэтаў» ад 5 верасьня 1931 г. да 30 чэрвеня 1932 г. заключылася ў тым, што яны прадаставілі сякую-такую працу для 42.722 беспрацоўных (гэта на 1 млн. беспрацоўных!) і то ў 70 проц. за кошт іншых працуючых рабочых, шляхам скарачэньня працы з адначасовым зьніжэньнем зарплаты.

«Сезонныя рабочыя.—піша «Роботнік», —у мінулым годзе атрымлівалі сякую-такую дапамогу хаця на цэнзуру нішчэўных 13 тыдняў, а ў бягучым яны не атрымаюць ні капейкі. А між тым, становішча беспрацоўных жахлівае. Беспрацоўныя харчуюцца сабачым мясам (Перамышль, Вільня), лушпінамі бульбы і інш. адкідамі з памыйных ямаў. Роспач гуляе па вуліцах цэлых гарадоў».

«Што робіць пан міністар Губіцкі? Чаго ён чакае?—крычыць у гістэрыцы орган польскага сацыял-фашызму. — Марудзіць нельга ні на хвіліну».

Так хістаецца глеба пад нагамі польскага фашызму. Лёкаі дрыжаць за сваю скуру.

Катастрафічнае зьмяншэньне ўжытку прадуктаў першай патрэбы ў Польшчы

ВАРШАВА. Паводле даных, зьмешчаных у «Статыстычных ведамасьцях», ужытак галоўнейшых прадуктаў першай патрэбы ў Польшчы зьменшыўся ў бягучым годзе да страшэнных памераў. Так, напрыклад, вугалю прадана ў кастрычніку гэтага году 1.532.049 тон, у той час, калі ў кастрычніку мінулага году прадана 1.944.790 тон. Цэмэнту прадана ў кастрычніку бягучага году 33.121 тона, а ў мінулым годзе за гэты-ж месяц — 42.707 тон, цукру адведена: 22.700 тон і 26.511. Тутуну прадана на 46.981 тыс. злотых супроць 52.794 тыс. злотых у кастрычніку мінулага году. Солі кухоннай адведена: 28.137 тон і 30.428 тон.

Як зазначае сацыял-фашысткі «Роботнік», нават ужываньне запалак зьменшылася, а імэнна—9.531 скрынь па 5.000 каробак, супроць 10.771 скрынь у кастрычніку мінулага году. Спажываньне белага хлеба і булак зьменшылася на 50 проц. у параўнаньні з леташнім годам.

Наогул, у бягучым годзе ўжываньне вугалю ўнутры краіны ўпала на 46 проц., у параўнаньні з 1931 г., нафты—на 46 проц., цукру—на 20 проц., солі—на 10 проц., тутуну—на 20 проц., запалак—на 30 проц.

Аднак, треба адзначыць, што гэтыя лічбы не адлюстроўваюць поўнасьцю зьмяншэньня ўжытку гэтых прадметаў у краіне. Нават эндэцкая газэта «Дзённік Віленскі» ў адным са сваіх апошніх нумароў пісала, што «мінулы год быў крызісным годам, таму зьмяншэньне спажываньня ўнутры краіны ў параўнаньні з нармальнымі гадамі значна большае, чым паказваюць паданыя вышэй лічбы».

Што азначае такі ўпадак ужываньня прадметаў пырошага ўжытку ўнутры краіны, хіба ня прыходзіцца гаварыць. Фашысцкая газэта ўказвае, што «гэта азначае галечу мільёнаў, голад, недаяданьне, холад, грып, сухоты. У гарадох усё больш часта падаюць ад вычарпаньня сіл, лічба самагубстваў з прычыны голаду расьце ў страшэнных разьмерах».

Хваляваньні беспрацоўных у Варшаве

ВАРШАВА, 23. Учора ў Варшаве ў радзе пунктаў гораду адбывалися буйныя выступленьні беспрацоўных. Група беспрацоўных уварвалася ў харчовы склад магістрату і захапіла вялікую колькасьць прадуктаў. Апрача гэтага, у радзе магазынаў беспрацоўныя разьбілі шыбы і захапілі шмат прадуктаў. Перад будынкам цэнтральнай і раённай біржы працы адбылася дэманстрацыя беспрацоўных. Хваляваньні беспрацоўных у Варшаве працягваюцца ўжо некалькі дзён. Буржуазныя газэты адзначаюць, што намады на магазыны і захоп харчовых прадуктаў беспрацоўнымі насілі арганізаваны характар. Паліцыя арыштавала больш 20 беспрацоўных.

Барацьба паміж імпэрыялістамі за гегемонію ў Сярэдняй Эўропе

ПРАГА, 23. У цэнтры ўвагі ўсяго чэхаславацкага друку стаіць пытаньне аб адносінах паміж краінамі Малой Антанты і Італіяй. Большая частка газэт падрабязна спыняецца на супярэчнасьці паміж Італіяй і Францыяй за гегемонію ў Сярэдняй Эўропе і непакоіцца адносна вывясьненьня Італіяй французкага ўплыву, а таксама адносна ўзмацненьня руху за перагляд існуючых граніц. «Багемія» ў перадавым артыкуле канстатуе: «Адносіны паміж Італіяй і Юга-славіяй пацягнуты да крайніх границ». Спрэчкі аб улажаньні Адрыятычным морам, — піша газэта, — невыратальны мірным шляхам. Наступная вайна выбухне або ў польскім калідоры, або ў Адрыятычным раёне. «Народна палітыка» піша: «Нязначныя ўступкі ніколі-б не задаволілі. Бэрлін і Рым, калі яны хочуць, вышэйшыўны Францыю, падымаюць пытаньне сфэры ўплыву ў Сярэдняй Эўропе павінны сабе ўяўляць, што яны гэтага могуць дабіцца толькі ў рэзультаце вайны».

Міністры на „паляваньні"

РЫГА 22. «Сацыял-дэмакрата» паведамляе, што члены латвійскага ўраду на чале з прэм'ер-міністрам запрошаны на паляваньне ў Польшчу ў ваколіцах Вільні. Газэта падае гэтаму запрашэньню сур'ёзнае палітычнае значэньне, лічачы, што гэта паляваньне ў Вільнскай вобласьці Літва павінна разглядаць, як дэмавстрацыю, накіраваную супроць яе. Здаецца, — піша «Сацыял-дэмакрата», — што цяперашні прэм'ер хоча ўцягнуць Латвію палкам у палітычны фарватар Польшчы, усе памылкі зямежнай палітыкі Латвіі зьбіраюцца, нарэшце, увенчаць яшчэ і тым, што Латвія стане васалам Польшчы, пры чым гэта робіцца ў той час, калі вынуждаюцца шляхі больш песных гаспадарчых адносін з Літвой і вядуцца перагаворы аб гандлёвым дагаворы з Савецкім саюзам.

Загатоўкі—у цэнтр увагі бальшавіцкага друку

Загатоўчы фронт—вастрэйшы фронт клясавай барацьбы. У барацьбе за скалачэньне і поўнае выкананьне плянаў загатовак праяўляецца баяздольнасьць партыйных, савецкіх арганізацый і кожнага камуніста ў паасобку. У барацьбе за абожжа, лён, мяса праяўляецца таксама і баяздольнасьць нашага друку.

Треба проста сказаць, што наш друк у загатоўчай кампаніі паказвае слабыя тэмпы работы. Гэта-ж факт, што замаль да апошніх дзён большасьць газэт абмяжоўвалася зьмешчаньнем на некалькі самацёчных допісаў.

Газэты не прывялі ў рух усе запасы ўзьдзеяньня на масы. Арганізацыйна-масавая работа, мабілізуючы рабселькораў, не паставлена як сьлед.

Зьмест матар'ялу, які зьмяшчаецца, яго палітычная завострасьць ні ў якім разе задаволіць ня могуць.

Хіба гэта можна назваць сапраўднай барацьбой з гнілым дэбералізмам, з перагаджанскімі элементамі, з кулацкім сабатажам, калі газэта зьяўляецца рэгістратарам, калі газэта канстатуе, што плян загатовак ня выконваецца, і трафарэтна робіць вывад «трэба ўдарыць», «РСІ патрэбна прыняць меры»? Кулацкі сабатаж трэба разьбіць не агульнымі алілюйскімі разважаньнямі, а вырыўцьцём канкрэтных вінаватых у патураньні кулаку, выкрыцьцём кулацкіх маноўраў, выкрыцьцём членаў сельсаветаў, камісій сялсвяшасьці, асобных камуністаў, якія ня толькі не змагаюцца за выкананьне пляну, але ўзначальваюць кулацкі сабатаж. Адначасова неабходна разгорнута паказваць перадавікоў загатоўчага фронту. У нас ёсьць рад раёнаў, сельсаветаў, калгасаў, якія ўжо выканалі плян загатовак, ударна рыхтуюцца да сяўбы. Треба паказаць іх так, каб іх вопыт, іх матад работы перанесьці на ўсе раёны, вёскі, заразіць іх прыкладам масы.

Асабліва адстае ў загатоўках адпаасобны сэктар. Треба з усёй рэзкасьцю сказаць, што нашы газэты амаль ігнаруюць адпаасобны сэктар. Недаацэнка гэтага сэктару, ніякіньне перанесьці недавыкананьне пляну ў адпаасобным сэктары на калгасы—гэта простае патураньне кулаку.

ЦК КП(б)Б і СНК БССР занесьлі на чорную дошку групу вёсак, раёнаў і сельсаветаў, якія злосна сабатуюць загатоўкі. У адносінах да раду сельсаветаў прыняты меры эканамічнай узьдзейнасьці.

Залача чыстага друку—растлумачыць палітычнае значэньне пастаноў ЦК КП(б)Б і Саўнаркому, арганізаваць грамадзкае ўзьдзеяньне на адстаючыя вёскі, сельсаветы і работы. Асабліва адказная задача падае на газэты раёнаў, якія занесены на чорную дошку. Треба кінуць усе сілы ў найбольш адстаючыя пункты, неадкладна правесьці, як выконваюцца пастановы ЦК і СНК. Лічбамі і фактамі даказаць аб магчымасьці і рэальнасьці выкананьня пляну; вывесьці на чыстую воду арганізатараў кулацкага сабатажу, гнілых дэбералаў, перагаджанцаў, апартуністаў усіх масьцей, пасаваць іх клясавы твар, артанізаваць адпоры пралетарскай дзяржаве калгасьнікаў і працоўных сялян—адпаасобнікаў на барацьбу з кулакамі і іх дапаможнікамі, на перамаганьне кулацкага сабатажу.

На лічбах і фактах свайго раёну, распублікі і саюзу ў цэлым треба паказаць рост заразу прамтавараў у вёску, сельска-гаспадарчых машын, рост кредытаў, рэгіяна роду ільгот, мерапрыемстваў па ўзьнятьці ўрадзайнасьці сацыялістычных палёў, на культурна-бытавым абслугоўваньні шырокіх мас сялянства.

На прыкладзе перадавых у Татэе—Маскоўскай вобласьці і Татарскай АССР, якія ўжо атрымалі магчымасьць выступіць на калгасны рынак з ліпкамі свайго абожжа, треба даказаць, што іменна з прычыны кулацкага сабатажу нашы перадавыя калгасьнікі і адпаасобнікі ня могуць ашчэ вызваліць на рынак ліпкай свайго абожжа. Чым больш энэргічна, чым больш жорсткім будзе наш удар па кулацкім сабатажы, па перагаджанцах і гнілых дэбералах, тым хутчэй мы выканаем рэспубліканскі плян загатовак і будзе даволен гандаль абожжам. Адначасова неабходна весьці рашучую барацьбу са спэкуляцыяй абожжам.

Бязумоўна, што ў гэтым кроўна зацікаўлены самі калгасьнікі і працоўныя адпаасобнікі, треба аб гэтым нашаму друку ясна растлумачваць.

Залачы падрытоўкі да весны, узьняцьця ўрадзайнасьці, арганізацыйна - гаспадарчае ўмацаваньня калгасаў таксама дыктуюць нам—бальшэвікам тэмпамі выканаць плян загатовак. Вядома, што чым хутчэй будзе выкананы плян загатовак, ссыпаны насенныя фонды, тым з большым посьпехам мы падрыхтуемся да веснавой кампаніі. Вось чаму газэтам неабходна ўмела ўвязваць усе гаспадарча-палітычныя задачы ў адзін вузел, выдзяляючы на даным этапе рашаючае зьвяно—загатоўкі.

Многія гарадзкія і раённыя газэты арганізавалі (правда, са значным спазьненьнем) вывясьня рэдакцыі. Треба толькі, каб нашы вывясьня рэдакцыі ўпачалі вопыт мінулай работы.

Па-першае, вывясьня рэдакцыям ва ўсёй сваёй рабоце треба апірацца на нізавыя газэты, арганізаваць рабселькораў на барацьбу за загатоўкі. Па-другое,—нельга адрываць ад сваёй асноўнай рэдакцыі, з найбольш каштоўны матар'ял і вопыт барацьбы за абожжа перадаваць праз старонкі сваёй газэты.

Асабліва важна зараз узмацненьне работы па кіраўніцтву нізавым друкам і рабсельскім рухам. Клясовы вораг ня толькі пры бае пралезьці ў сельсавет, калгас у якасьці рахункавода, кладаўшчыка і г. д., кулак спрабуе пралезьці ў сельскараўскія рады, у кіраўніцтва насьпенгазетай з тым, каб выкарыстаць друк у сваіх мэтах.

Удзел рабселькораў у сучаснай загатоўчай кампаніі неадпаўдальнаючы. Што патрабуецца ад рабселькора? Па-першае, самому акуратна на выконваць абавязкі перад дырэкцыяй. Сабатажнику ня месца ў рабселькораўскіх радох. Па-другое, пад кіраўніцтвам партыі арганізаваць адпор кулацкаму сабатажу, выкрываць праз друк мацнёры кулакоў і іх агентаў. Селькор, які стаіць у баку ад тэй барацьбы, што праводзіцца за абожжа, які патурае кулаку, ня можа насіць ганаровай годнасьці рабселькора.

Нізавыя газэты павінны перайсьці на больш часты выхад, бо ў загатоўчай кампаніі вырашаюць дні. Таму газэта, якая выходзіць нерэгулярна або вельмі рэдка, фактычна стаіць у баку ад загатовак. Нізавая газэта мае тую перавагу перад цэнтральнай і ваат раённай газэтай, што можа на працягу 2-3 нумароў закрануць амаль усе двары. Газэта можа спыніцца на ўсіх пасобку, канцэнтруючы ўдар па крыўдчыках, сабатажніках загатовак, пры адначасовым паказе перадавікоў.

Адказныя задачы ўскладаюцца на газэты ільнаводчых раёнаў. БСОР па ільназагатоўках займае значнае месца ў агульнасаюзным пляне. Ад пасьпяховасьці выкананьня пляну ільназагатовак у нас залежыць пасьпяховасьць работы сацыялістычнай прамысловасьці. Лён патрабуе раду прадпрыемстваў апрацоўкі. Зразумела, што ўсё гэта ня зробіцца самацёкам. Треба арганізаваць ударную работу на ільнамялках і сушыльных пунктах, перанесьці іх на трохзьменную работу, змаганьня са спробамі разбазараваньня ільнавалакна, стварыць поўную пастаянныя брыгады, разгарнуць сацсаборніцтва паміж брыгадамі і пунктамі. Але няправільна і шкодна паступае асьвейская газэта, якая, да рэчы, амаль зусім не змагаецца за лён.

Газэтам неабходна памятаць, што работа па апрацоўцы ільну павінна быць падпарадкавана цэнтральнай задачы—здачы ільнавалакна. Неабходна праз газэты растлумачыць значэньне тых ільгот, якія даюцца ільнавалакнам, праверыць, як скарыстоўваюцца фонды прамтавараў і абожжа, змагацца супроць разбазараваньня гэтых фондаў не прызначаньні.

Газэта ільнаводчых раёнаў, як і ўвесь друк БССР, ніясуць поўную адказнасьць за далейшы ход ільназагатовак, за выкананьне пляну і выпаўнальны тэрміны.

Асабліва недапушчальна ігнаруюцца друкам мясазагатоўкі. У лепшым выпадку вымяшчаюцца «бухгальтарскія» зводкі аб ходзе мясазагатовак і дзьве-тры заметкі з пунктаў погляду «выконваюць» або «ня выконваюць». Арганізацыйна-масавая работа адсутнічае. Няма чаго даказваць, што такое ігнараваньне стаіць над патрэбу выкананьне пляну мясазагатовак, грае на руку кулаку.

Райкомам партыі, у прыватнасьці, Дуброўенскаму, Церахаўскаму, Веткаўскаму, Тэлавчыцкаму неабходна безадкладна праверыць работу сваіх райгазэт, як яны змагаюцца за мяса і наогул за выкананьне пляну загатовак.

Усяму друку треба паставіць у цэнтр увагі папулярызацыю пункту пастановы ЦК і СНК «аб тым, што калгасьнікі і адпаасобнікі, якія акуратна выконваюць пляны мясазагатовак, маюць права забіваць жывёлу і свабодна прадаваць мяса на рынку і што ў адносінах да тых, хто будзе ўхіляцца ад сваячасовай здачы (продажу), будуць ужывацца меры ўзьдзеяньня, прадугледжаныя законам» (з пастановы пленуму ЦК КП(б)Б).

Транспартным газэтам і ўсяму друку неабходна ўстанавіць кантроль за перавозкай жывёлы, выкрываючы злачынныя адносіны да жывёлы, якія вядуць да вялікіх страт мясных рэсурсаў.

Пастанова ЦК і СНК аб загатоўках масла, сыру і малака мае выключна гаспадарча-палітычнае значэньне. Друку неабходна зараз-жа павесьці растлумачальную работу па арганізацыі шырокіх працоўных мас на выкананьне ва ўстаноўленыя каляндарныя тэрміны пляны здачы малака.

***

Даны этап сацыялістычнага будаўніцтва прадугледзе да бальшавіцкага друку павышаны патрабаваньні. Газэта робіцца жывымі людзьмі. Ад складу работкікаў рэдакцый, ад іх клясавай стойкасьці і адданасьці справе камунізму, ад штодзеннага партыйнага кіраўніцтва залежыць баяздольнасьць газэты.

Ліст, апублікаваны ў «Рабселькоры» аб Талачынскім раёне і яго газэце, дае просты сыгнал, што ў талачынскай газэце заселі чужыя людзі. Треба ўсім газэтам даклала прыглядзецца да свайго складу, ачысьціўшы ся ад усяго гнілога і перагаджанцкага. У бальшавіцкай газэце могуць працаваць толькі людзі да канца адданыя справе камунізму.

За апошнія дні задзвяжецца некаторае ўмацненьне ўвагі залотоўкам з боку цэнтральных і часткі раённых газэт. Але няма нішкіх палстаў на гэтым супакойвацца. Кулацкі сабатаж яшчэ ня зломлен. Яшчэ вастрэй треба атачыць сваю зброю, канчаткова дабіць ворага.

Г. ФУКСОН.

Паведамленьне

25 сьнежня, роўна ў 10 гадз. 30 хвіл. раніцы прапануецца зьявіцца САКРАТАРОМ ЯЧЭЕК КП(б)Б, ЛКСМБ ВНУ і РАБФАКАЎ І САКРАТАРОМ ЯЧЭЕК КП(б)Б ТЭХНІКУМАЎ — у ЦК КП(б)Б (агітмасавы аддзел, другі паверх, пакой 39).

Яўка абавязкова без спазьненьня са сьпісамі актыву ячэйкі.

ЦК КП(б)Б.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

Памяшканьне Польскага дзярж. тэатру Савецкая, 26 тэл. 15-20

БЕЛАРУСКІ РАБОЧЫ ТЭАТР ЦСПСБ

СЁНЬНЯ

КУХНЯ СЬВЯТАСЬЦІ

сатырычная апэрэта у 3-х дзеях.

Пастаноўка Б. Я. Гэлэўчынера.

Музыка Цікоцкага. Танцы Е. І. Вульф.

Пачатак роўна ў 8 г. 30 м.

ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА Каса—ад 12 г. дня

Гуканы мастацкі фільм СУСТРЭЧНЫ

ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ Каса—ад 12 г. дня

Замежны мастацкі фільм Пасьнікі Бэрліну

Звыш праграмы—кіно-хроніка

Пралетары

ВЫСПА ТОГУЙ драма ў 6 частках.

Дзіцячыя дзіцячыя сэансы ПЕРШАЯ КОННАЯ

СПАРТАК Каса—ад 1г. дня

Выдатны фільм Трыпольская трагедыя трагедыя ў 7 частках.

АНОНС! ГЭТЫМІ ДНЯМІ АДКРЫВАЕЦЦА першы ў Беларусі дзіцячы кіно-тэатр „Юны піянэр", Савецкая, 90 (памяшканьне былой кірхі).

Беларускае аддзяленьне дзяржаўнага аб'яднаньня музычных, эстрадных і цырковых прадпрыемстваў „ДАМЭЦ"

склікае сёньня, 25 сьнежня г. г., у 2 гадз. дня

НАРАДУ работнікаў „ДАМЭЦ'а"

З ПРАДСТАЎНІКАМІ ГРАМАДЗКАСЬЦІ.

ПАРАДАК ДНЯ: 1. Пастанова Наркамасьветы РСФСР аб рабоце „ГОМЭЦ'а" і вынікі першага ўсесаюзнага зьезду дырэктароў „ГОМЭЦ'а" дакл. дырэктар „КЭЧ'а Ленкрайгомэц'а" т. Краўзэ.

Нарада адбудзецца ў малой залі клюбу мэталістаў (Університэцкая, 12).

Запрашаюцца прадстаўнікі зацікаўленых арганізацый, грамадзкасьці і прадстаўнікі друку. БелДАМЭЦ.

ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА БЕЛАРУСІ

Сэктар кнігагандлю.

Выйшлі з друку

І ПАСТУПІЛІ Ў ПРОДАЖ:

1. Блёк-нот агітатара № 13-14 сьнежаньскі пленум ЦК КП(б)Б,—ц. 30 к.
2. Рэзалюцыі сьнежаньскага пленуму ЦК КП(б)Б, — ц. 15 к.
3. Рэзалюцыі IV пленуму ЦКК КП(б)Б

гэтымі днямі выходзіць з друку:

Культпроп ЦК КП(б)Б—Для масавай сеткі партасьветы.

Выпінні сьнежаньскага пленуму ЦК КП(б)Б, — ц. 30 к.

Менскай рэспубліканскай 2-гадовай сэкупэртшколе сакратар-навучыльніцтва, ПРАЖАДНА СА СВАЁЙ МАЦЫНКАЙ.

патрэбен

Плата па згодзе. Заявы падавать тэхсакратару культпропу Мен. ГК КП(б)Б (пакой 24) вул. К. Маркса.

АДКРЫТА ПАДПІСКА на 1933 год

на палітыка-эканамічны

ДВУХТЫДНЁВІК—орган ЦК КП(б)Б

„БАЛЬШАВІК БЕЛАРУСІ"

„БАЛЬШАВІК БЕЛАРУСІ"—

зьяўляецца бацькам палітычным органам ЦК КП(б)Б, які разгортае на аснове Марксізму—Ленінізму злабадзнейшыя тэарэтычныя праблемы, зьвязаныя з сацыялістычным будаўніцтвам СССР і БССР і дапамагае арганізацыі і мабілізацыі мас на барацьбу за пабудову сацыялізму.

„БАЛЬШАВІК БЕЛАРУСІ"—

асьвятляе асноўныя пытаньні міжнародняй рэвалюцыйнай барацьбы пралетарыяту і асабліва пытаньні, зьвязаныя з асноўнымі палітыка-эканамічнымі прэцэсамі ў Польшчы і Заходняй Беларусі, становішчамі чарговымі задачамі КПП і КПЗБ.

„БАЛЬШАВІК БЕЛАРУСІ"—

вядзе распрацоўку пытаньняў ленінскай нацыянальнай палітыкі, змагаецца за яе ажыцьцяўленьне на аснове рашучай барацьбы з ухілам у бок вялікадзяржаўнага шавінізму—галоўнай небясьпекай на даным этапе, контр-рэвалюцыйным нацыяналістычным нацыяпартынізмам і мясцовым шавінізмам усіх колераў.

„БАЛЬШАВІК БЕЛАРУСІ"—

сваячасова паведамляе тэарэтычнага і палітычнага ўзроўню шырокіх мас партыйнага актыву, вядзе распрацоўку асноўных прынцыповых пытаньняў гісторыі КП(б)Б.

„БАЛЬШАВІК БЕЛАРУСІ"—

вядзе крытыку і бібліяграфію літаратуры па асноўных партыйна-тэарэтычных праблемах.

„БАЛЬШАВІК БЕЛАРУСІ"—

цьвёрда змагаецца за генэральную лінію партыі супроць усякіх ухілаў і прыхільніцтва да іх.

ПАДПІСНАЯ ЦАНА на 1933 год.

на 1 месяц — 50 к. на 6 мес. — 3 р.
на 3 месяцы — 1 р. 50 к. на 12 мес. — 6 р.

Падпіска прымаецца на пошце, лістаносцамі і ўпаўнаважаным па партыруку пры партячэйках.

БЕЛПАПЕРТРЭСТУ ПАТРЭБНЫ

ў ад'езд на фабрыкі ў раёне:

2 ГАЛОЎНЫЯ

або старшыя бухгальтары

з прадастаўленьнем камунальных паслуг.

Зварачацца: Рэвалюцыйная, 3, Белпапертрэст, сэктар вучоты і справаздачнасьці з 9 да 15 гадзін.

БЕЛКАМУНБАНК

даводзіць да ведама ўсіх кліентаў,

якія маюць пераходзячае на 1933 г.

пачатае і незакончанае ў 1932 годзе жыльлёвае, камунальнае, культурна-бытавое і ведамственнае будаўніцтва,

што яны абавязаны не пазьней 10-га студзеня 1933 г.

ПРАДСТАВІЦЬ У БЕЛКАМУНБАНК:

1) акт тэхнічнай гатоўн